Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 245 (5078)
1 ЛІСТАПАДА
1
ЧА ВЕР
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

„Інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочымі капіталістычных краін, брацкі саюз рабочых СССР — рабочымі ўсіх краін — вось адзін з краяўгольных камней сілы і магутнасці рэспублікі советаў“ (СТАЛІН). Вышэй сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма!

ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ

Адным з важнейшых пытанняў арганізацыйнай перабудовы партыйнай работы на аснове рашэнняў XVII з'езда з'яўляецца пытанне павелічэння персанальнай адказнасці і ўзмацнення авангардной ролі комуніста. Для таго, каб кожны комуніст выступаў сапраўдным арганізатарам мас, агітатарам і прапагандыстам за ажыццяўленне лініі партыі, ён перш за ўсё абавязан «нястомна працаваць над павышэннем сваёй ідэйнай узброенасці, над усваеннем асноў марксізма-ленінізма, важнейшых палітычных і арганізацыйных рашэнняў партыі і растлумачваць іх партыйным масам».

Дапамагчы комуністу павышаць свой ідэйны ўзровень, стварыць яму ўсе ўмовы для паспяховай і нармальнай вучобы — гэтым павінны абавязак партыйных камітэтаў (раённых, гарадскіх), парторгаў.

У падрыхтоўцы да асенне-зімовай партвучобы вясковых партарганізацый і разгарнуўшайся вучобы гарадскіх школ добра ўлічаны недахопы мінулага года. Агульнага падыходу да ўсіх комуністаў, асабліва вясковых партарганізацый, які меўся ў мінулым годзе, зараз няма. Рэкамендуемыя ЦК ВКП(б) формы вучобы даюць магчымасць упічыць узровень палітычнай падрыхтоўкі і жаданне кожнага комуніста, кандыдата партыі і спачуваючага.

З сёнешняга дня ва ўсёй вясковай партыйнай арганізацыі пачынаецца партыйная вучоба. Недахопы, якія выявіліся ў першыя дні заняткаў гарадской партыйнай сеткі, давалі магчымасць раённым партыйным камітэтам унікнуць іх паўтарэння ў вясковай сетцы партасветы, перанесці лепшы вопыт гарадскіх школ у вёску. Таму заняткі вясковай партыйнай сеткі з сёнешняга дня павінны праходзіць нармальна, без зрываў, на высокім палітычным узроўні.

Але падрыхтоўчая работа яшчэ не забяспечвае высокай якасці вучобы. Увага і клопаты райкомаў, інструктараў, палітаддзелаў і парторгаў да работы партыйных школ павінна быць сістэматычнай, дзейсная. ЯНА Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЗАКЛЮЧАЕЦЦА Ў ТЫМ, КАБ НЕ ДАПУСКАЦЬ ЗРЫВАЎ ЗАНЯТКАЎ. Між тым, мы маем ужо факты грубага парушэння дырэктыў партыі аб партыйнай вучобе. Крупская партыйная арганізацыя, у якой заняткі партыйнай сеткі пачаліся ў кастрычніку, дапусціла зрывы работы школ у першы дзень заняткаў. Гэтыя зрывы адбыліся таму, што раённыя кіраўнікі не выехалі ў вёску. РАЙКОМЫ ПАРТЫІ АБАВЯЗАНЫ ПРЫЦЯГВАЦЬ ДА СУРОВАЙ АДКАЗНАСЦІ ЗРЫЎШЧЫКАЎ ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ.

Поспехі заняткаў будуць залежаць яшчэ і ад таго, наколькі памяшканне, у якім працуе школа, гурток або семінар будзе адпавядаць нармальным заняткам. Таму пра цёплае памяшканне, газу, крэслы і дастатковую колькасць неабходных дапаможных матэрыялаў (карта, глобус і інш.) павінны клапаціцца партыйныя кіраўнікі.

Нельга ні ў якім разе, як гэта рабіў памочнік начальніка палітаддзела Мазырскай МТС т. ФРАЙМАН, ставіць пытанне так, што забеспячэнне газай і інш. матэрыяламі датычыць толькі райкома, а не палітаддзела. Трэба памятаць, што ад гэтых «дробязей» залежыць якасць марксісцка-ленінскага выхавання комуністаў.

Сакратары райкомаў, парткомаў і палітаддзелаў парторгі асабіста абавязаны сістэматычна займацца пытаннямі якасці марксісцка-ленінскага выхавання. Каштоўным з'яўляецца метад абмеркавання работы школы на парткоме магілёўскай шаўковай, у прысутнасці ўсіх слухачоў школы. Але справа, безумоўна, не ў форме кіраўніцтва школай, а ў тым, каб пытанне работы партыйных школ, гурткоў, вучобы комуніста-адзіночкі займалі ў рабоце парткома, райкома, парторга такое-ж месца, якое займае выкананне гаспадарча-палітычных кампаній. Каб слухач школы, прапагандыст адчувалі-б, што дапамога і правільна арганізаваная вучоба даюць ім магчымасць ідэйна ўзбройвацца на барацьбу за выкананне дзяржаўных і партыйных заданняў, за якія змагаецца партыйная арганізацыя.

У гэтай дапамозе райкомаў партыі, партгабінетаў асаблівае месца павінен заняць ПРАПАГАНДЫСТ. Прапагандыст зможа даць слухачу добрыя веды толькі тады, калі работа пропсемінара будзе строга прыстасавана для яго падрыхтоўкі як палітычна, так і метадычна. У гэтым годзе, калі да прапагандысцкай работы ўпершыню прыступіў шырокі партыйны актыў, ён асабліва патрабуе папярэдняй прапрацоўкі кожнай тэмы на пропсемінары, каб семінарам кіравалі лепшыя прапагандысты раёна, каб іх работа не зрывалася.

АСАБЛІВАЯ ЎВАГА ПАВІННА БЫЦЬ ЗВЕРНУТА НА МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЕ ВЫХАВАННЕ АКТЫВА. Практыка мінулых год паказала, што вучоба актыва часта зрывалася з-за загружанасці практычнай работай, актыў «не паспяваў» вучыцца, ён знаходзіўся ў сельсоветах. Работнікі раённага актыва — члены бюро райкома, члены прэзідыума РВК, інструктары — павінны быць ахоплены формамі адпаведнай іх падрыхтоўцы вучобы.

Тут добра зрабіў Клімавіцкі райком партыі, які абавязаў комуністаў-раённых работнікаў, дзе-б кожны з іх не быў, у дзень заняткаў прыбыць на месца работы школы або гуртка і забараніў раённым арганізацыям у дні партвучобы адкамандзіроўваць комуністаў на якую-б там ні было работу.

Дні партыйнай вучобы для кожнага комуніста, дзе-б ён ні працаваў, павінны быць непарушны. Барацьба за высокую ЯКАСЦЬ партыйнай вучобы, штодзённыя клопаты партарганізацыі аб рабоце школ дадуць магчымасць зрабіць гэты навучальны год годам найбольшага размаху важнейшай работы партарганізацыі — марксісцка-ленінскага выхавання комуністаў.

НАГЛЫ АНТЫСОВЕЦКІ ВЫПАД ЧЭХАСЛАВАЦКАЙ ПАЛІЦЫІ

Беспадстаўны арышт совецкіх спартсменаў

ПРАГА, 29 кастрычніка. (БЕЛТА). Учора ў Кошыцы былі арыштаваны 12 совецкіх атлетаў, калі яны з адказным сакратаром Вышэйшага совета фізічнай культуры СССР Дземіным аглядалі горад у суправаджэнні некалькіх рабочых. Паліцыя сцвярджала, што гэта прагулка прадстаўляе сабой забароненую «комуністычную дэманстрацыю». Апрача совецкіх атлетаў, былі арыштаваны таксама Дземін і 16 чэхаславацкіх рабочых.

***

ПРАГА, 29 кастрычніка. (БЕЛТА). Згодна афіцыяльнага паведамлення, у Кошыцах «совецкія спартсмены дазволілі комуністычнаму дэпутату Валло ўцягнуць сябе ў забароненую вулічную дэманстрацыю, якая праходзіла па вуліцах са спевам рэволюцыйных песень і «Інтэрнацыянала». З прычыны таго, што гэта пагражала грамадскаму спакою і парадку, 20 чалавек, а таксама Валло, былі адпраўлены ў паліцэйскае ўпраўленне і арыштаваны. У сувязі з гэтым увечары адбываліся далейшыя комуністычныя дэманстрацыі. Совецкія спартсмены сёння прадстануць перад паліцэйскім судом. Яны панясуць кару і будуць высланы з Чэхаславакіі».

Рабочая газета «Алло» са слоў сведак паведамляе, што для арышту совецкіх спартсменаў не было ніякіх падстаў. Спартсмены былі запрошаны ў якасці гаваровых гасцей на мітынг атлетаў, які адбыўся ў сувязі з чэхаславацкім нацыянальным святам. Пасля гэтага спартсмены па запрашэнню мясцовых адміністратыўных улад аглядалі розныя выдатныя рэчы, пры чым іх суправаджалі некалькі кошыцкіх рабочых. Уся група, налічваўшая каля 20 чалавек, спакойна праходзіла па вуліцах, не распяваючы ніякіх песень. Спартсменаў раптам нагнаў паліцэйскі аўтамабіль. Паліцэйскія акружылі іх і заявілі, што яны разам з суправаджаючымі іх арыштаваны. Дэманстрацыі пачаліся толькі пасля таго, як узнеслася вестка аб арышце совецкіх спартсменаў.

Вячэрні друк скарыстоўвае інцыдэнт у Кошыцах для цкавання, накіраванага супроць компартыі.

***

ПРАГА, 30 кастрычніка. (БЕЛТА). Совецкія спартсмены яшчэ пад арыштам у Кошыцах. Расследваннем інцыдэнта займаюцца міністэрствы замежных і ўнутраных спраў.

РАЗГУЛ БЕЛАГА ТЭРОРА У ІСПАНІІ

МАДРЫЖ, 31 кастрычніка. (БЕЛТА). Карэспандэнт «ЖУР» паведамляе: «Уся Паўночная Іспанія прадстаўляе сабой ваенны лагер. Вакзалы ператвораны ў казармы. Па дарогах раз'язджаюць пяхотныя кухні. Поезды перапоўнены салдатамі. Ствараецца сапраўднае ўражанне вайны. Улады адчуваюць сур'ёзныя затрудненні з-за недахватаў турмаў. У турмы ператвараюцца нават сярэднявяковыя поўразбураныя крэпасці.

«ЮМАНІТЭ» абвяргае чуткі аб смерці члена ЦК іспанскай компартыі ПАСІАНАРЫЯ. За Пасіанарыя прынялі другую жанчыну, паўшую пад кулямі афрыканскіх легіянераў. Не пацвердзілася таксама чутка аб смерці сакратара комсамола Каталоніі ЛІНА, якая толькі лёгкі ранена і працаўжае сваю работу на чале каталонскіх комсамольцаў.

ЛОЗУНГІ ДА XVII ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРА

1. Няхай жыве XVII гадавіна Окцябрскай соцыялістычнай рэволюцыі ў СССР! Няхай жыве соцыялістычная рэволюцыя ва ўсім свеце!

2. Пролетарыі ўсіх краін! Прыгнечаныя народы калоній! Вышэй сцяг ЛЕНІНА! Уперад, на штурм капіталізма!

3. У краінах капіталізма мільёны рабочых і сялян асуджаны на голад, галечу і разарэнне. У СССР улада совецтаў вызваліла працу рабочых і сялян ад эксплуатацыі, знішчыла беспрацоўе і жабрацтва, забяспечыла перамогу калектывізма ў вёсцы. Пролетарыі і сяляне ўсяго свету, ідзіце па шляху рабочых і сялян СССР!

4. Братам па класу, вязням капіталізма, ахвярам крывавага фашызма, барацьбітам за перамогу рабочага класа — наша пролетарскае прывітанне!

5. Пролетарыям Іспаніі — перадавым гераічным барацьбітам супроць фашызма, супроць капіталізма — наша брацкае прывітанне!

6. Рэволюцыйным пролетарыям Германіі большэвіцкае прывітанне! Няхай жыве гераічная комуністычная партыя Германіі! Няхай жыве тав. ТЭЛЬМАН! Вырвем яго з рук фашысцкіх катаў. Свабоду тав. Тэльману, свабоду палоннікам фашызма!

7. Рабочыя і работніцы ўсіх краін! Пашырайце і ўмацоўвайце адзіны фронт барацьбы супроць фашызма, супроць капіталізма. Згуртоўвайцеся вакол Комуністычнага Інтэрнацыянала!

8. Імперыялісты арганізуюць новыя войны, рыхтуюць напад на бацькаўшчыну працоўных усяго свету — Совецкі Саюз. Далоў правакатараў вайны! Далоў імперыялізм! На абарону краіны Совецтаў — радзімы ўсіх працоўных!

9. Няхай жыве наша родная Чырвоная армія — магутны аплот мірнай палітыкі совецкай улады, пільны вартавы совецкіх граніц, верны страж нашай вялікай радзімы!

10. «Ні адной пядзі чужой зямлі не хочам. Але і сваёй зямлі, ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддамо нікому». (Сталін).

11. «Мы стаім за мір і адстойваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны». (Сталін).

12. Таварышы чырвонаармейцы і чырвонафлотцы, будзьце меткімі стралкамі, вопытнымі артылерыстамі, бясстрашнымі пётчыкамі, мужнымі танкістамі. Авалодвайце ў дасканаласці ваеннай тэхнікай, будзьце заўсёды гатовы да абароны нашай радзімы!

13. Мужным сынам нашай радзімы, героям Совецкага Саюза, адважным заваявальнікам паветра палкае прывітанне!

14. Рабочыя і работніцы, калгаснікі і калгасніцы! Змагайцеся за выкананне 2-й пяцігодкі, за дапешы ўздым матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных, за пабудову бяскласавага соцыялістычнага грамадства. Уперад, да новых перамог!

15. «У перыяд першай пяцігодкі мы здолелі арганізаваць энтузіязм, пафас НОВАГА БУДАЎНІЦТВА і дабіліся рашаючых поспехаў»...

Цяпер гэту справу павінны мы дапоўніць энтузіязмам, пафасам АСВАЕННЯ новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным падняццем прадукцыйнасці працы, сур'ёзным скарачэннем сабекошту. «У ГЭТЫМ ЦЯПЕР ГАЛОЎНАЕ». (Сталін).

16. Ударнікам і ўдарніцам, перадавым барацьбітам вялікай арміі будаўнікоў соцыялізма — большэвіцкае прывітанне! Вышэй сцяг соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва!

17. Даб'ем абязлічку ў рабоце і ўраўнілаўку ў сістэме зарплаты. Умацуем соцыялістычныя формы арганізацыі і аплаты працы! За поўную загрузку самага кароткага ў свеце рабочага дня!

18. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі металургіі! Асвойвайце тэхніку вытворчасці! Змагайцеся з прастоямі! Поўнасцю выканаем план чорнай і каляровай металургіі! Дамо краіне метал высокай якасці!

19. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі вугальных басейнаў! Змагайцеся за поўнае скарыстанне кожнага механізма! Множце рады ўдарнікаў! [illegible]

20. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі нафтавых прамысловасці! За поўную загрузку рабочага часу! За поўнае скарыстанне буравога абсталявання! Ліквідуем адставанне нафтавай прамысловасці!

21. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі чыгуначнага транспарта! Выканаем з гонарам план асенне-зімовых перавозак! Забяспечым прамысловыя цэнтры вугалем, металам, бавоўнай, хлебам, гароднінай! За працоўную дысцыпліну на транспарце!

22. Рабочыя і работніцы, інжынеры і тэхнікі лёгкай і харчовай прамысловасці! Змагайцеся за выкананне і перавыкананне плана вытворчасці! За беражлівыя адносіны да сырцу, за ліквідацыю браку, за паляпшэнне якасці! Дамо спажыўцу добрую прадукцыю!

23. Ударнікам і ўдарніцам будаўнікам метрапалітэна нашай чырвонай сталіцы — большэвіцкае прывітанне!

24. Калгаснікі і калгасніцы! Умацоўвайце калгасны лад. Дабіце астаткі кулацтва! Дапамагайце працоўным аднаасобнікам уступіць у калгасы! Зробім усе калгасы большэвіцкімі, усіх калгаснікаў заможнымі! Няхай жыве саюз рабочых і сялян, пабеданосна будуючых соцыялізм!

25. Прывітанне калгасам, калгаснікам і калгасніцам, выканаўшым свае абавязацельствы перад рабоча-сялянскай дзяржавай!

26. «Справу жывёлагадоўлі павінны ўзяць у свае рукі ўся партыя, усе нашы работнікі, партыйныя і беспартыйныя, моцны на ўвазе, што праблема жывёлагадоўлі з'яўляецца цяпер такой-жа першачарговай праблемай, якой была ўчора ўжо вырашаная з поспехам праблема зерновая». (Сталін).

27. Ні аднаго калгаса без жывёлагадоўчай таварнай фермы! Калгаснікі і калгасніцы! Даб'ем высокіх удояў, добрага нагулу жывёлы, беражлівага вырошчвання маладняка! За под'ём соцыялістычнай жывёлагадоўлі!

28. Рабочыя і работніцы соўгасаў! Зробім кожны соўгас узорам буйнага соцыялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі! За найстражэйшую дзяржаўную дысцыпліну работнікаў соцыялістычнага земляробства!

29. Зробім усе калгасы большэвіцкімі, [illegible] шкодніку, лодыраў, злодзеяў і рэкасадальнікаў грамадскай уласнасці! Дамочнім рэволюцыйную пільнасць!

30. За далейшае паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў працоўных! Даб'емся ўзорнай работы нашай кааперацыі! За узорнае грамадскае харчаванне і культурнае жыллё для рабочых! За ўпарадкаванне гарадоў і вёсак!

31. «Разгортванне совецкага гандлю з'яўляецца той актуальнейшай задачай, без вырашэння якой немагчыма далей ісці наперад». (Сталін). За разгортванне і ўмацаванне таваразвароту. За культурны совецкі гандаль!

32. Соцыялістычная ўласнасць свяшчэнна і недатыкальна! За ахову грамадскай соцыялістычнай уласнасці — асновы совецкага ладу!

33. «Моцкая і магутная дыктатура пролетарыята — вось што нам трэба цяпер для таго каб развеяць у прах апошнія астаткі паміраючых класаў і разбіць іх злодзейскія махінацыі» (Сталін).

34. Пад сцягам совецтаў перамога Окцябрская рэволюцыя, Няхай жывуць советы — праваднікі Ленінскай палітыкі, арганізатары будаўніцтва соцыялізма і абароны нашай вялікай радзімы!

35. Умацуем советы — органы пролетарскай дыктатуры! За паглыбленне, актыўны ўдзел усіх працоўных у выбарах совецтаў! Лепшых ударнікаў і ўдарніц, лепшых байцоў за соцыялізм, знатных людзей нашай краіны — выберам у СОВЕТЫ!

36. За адзінства і брацтва працоўных усіх нацыянальнасцей Совецкага Саюза! Няхай жыве ленінская нацыянальная палітыка!

37. «Інтэрнацыянальныя сувязі рабочага класа СССР з рабочымі капіталістычных краін, брацкі саюз рабочых СССР з рабочымі ўсіх краін — вось адзін з краяўгольных камней сілы і магутнасці рэспублікі совецтаў». (Сталін). Вышэй сцяг пролетарскага інтэрнацыяналізма!

38. Таварышы профсаюзныя работнікі! Палепшым работу профсаюзаў, правядзем сапраўдную іх перабудову! Бліжэй да мас, бліжэй да вытворчасці! Больш клопатаў аб дабрабыце, паляпшэнні культурна-бытавога абслугоўвання працоўных!

39. Па-баявому разгорнем кантроль выканання дырэктыў партыі і ўрада! Праз школу масавага кантролю выкуем з ударнікаў і лепшых актывістаў кадры дзяржаўных дзеячоў! Мацней агонь самакрытыкі супроць бюракратычных яваў і недахопаў апарата!

40. За вылучэнне ўдарніц фабрык, заводаў, калгасаў, і соўгасаў на кіруючыя пасты! Няхай жыве ўзрастаючая грамадская актыўнасць працоўных жанчын!

41. Комсамольцы і комсамолкі! «Будзьце дастойнымі сынамі і дочкамі нашай маткі — усесаюзнай комуністычнай партыі». (Сталін). Няхай жыве комсамольскае племя — магутны рэзерв і надзейны памочнік большэвіцкай партыі!

42. Юныя піонеры! Умацоўвайце дысцыпліну ў школе, авалодвайце асновамі навукі! Будзьце гатовы продаўжаць і завяршыць вялікую справу Леніна!

43. Няхай жывуць работнікі навукі і тэхнікі, мастацтва і літаратуры, якія ідуць рука ў руку з рабочым класам у вялікай справе будаўніцтва соцыялізма і ўзмацнення абароны нашай радзімы!

44. Няхай жыве ВКП(б) — праводыр і арганізатар пабеданоснага будаўніцтва соцыялізма!

45. Рабочыя і калгаснікі! Цясней рады вакол ВКП(б)! За генеральную лінію партыі! За перамогу соцыялізма!

46. Арганізацыйную практычную работу на ўзровень грандыёзных задач 2-й пяцігодкі! Шырэй дарогу новым растучым арганізатарам!

47. Рэволюцыйная тэорыя — зброя ў барацьбе пролетарыята за соцыялізм! За аўладанне асновамі марксізма-ленінізма! За павышэнне ідэйна-палітычнай падрыхтоўкі членаў большэвіцкай партыі!

48. Ачысцім партыю ад усіх ненадзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элементаў! Далоў памочнікоў класавага ворага, правых і «левых» апортуністаў! Няхай жыве большэвіцкае адзінства ленінскіх радоў! Няхай жыве жалезная дысцыпліна партыі!

49. Няхай жыве вялікі і непераможны сцяг Маркса-Энгельса-Леніна!

Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў)

Новымі перамогамі сустрэнем окцябрскую гадавіну і перавыбары советаў

МЕНСКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛАН ЗАГАТОВАК ІЛЬНОВАЛАКНА

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО СНК БССР—тав САА(ЯНУ

Паведамляем, што Менскі раён, рэалізуючы ўказанні тав. Гікало аб падрыхтоўцы да окцябрскіх урачыстасцей, 31 кастрычніка г. г. скончыў выкананне загатовак ільновалакна якасцю нумарам значна вышэй устаноўленага нам урадам.

Гэтым самым наш раён заканчвае аспоўныя гаспадарча-палітычныя кампаніі бягучага года.

Хлебазагатоўкі закончаны на 62 дні раней у параўнанні з мінулым годам. Выкананы поўнасцю абавязковыя пастаўкі бульбы і заробленай натураплаты. На аснове шырока разгорнутай масавай работы перавыкананы даныя нам заданні па закупках хлеба.

Закончан план зяблівага зорыва і сіласавання. Поўнасцю ўбрана бульба і гародніна, як больш познія культуры. Засыпаны насенныя і страхавыя фонды бульбы і ў радзе калгасаў прыступілі да размеркавання ўраджаю. Поўнасцю выкананы план камплектавання буйнай рагатай жывёлы па калгасных таварных фермах.

У выніку паспяховага выканання ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў раён мае масавы прыліў лепшай часткі аднаасобнікаў у калгасы, і замест 75 проц. калектывізацыі на 1-І 1934 года, на сёнешні дзень раён ужо калектывізаваны на 85 проц. (за кастрычнік уступіла ў калгасы 700 гаспадарак і арганізавана 5 новых калгасаў).

Пераключаемся на заканчэнне абмалоту, засыпкі насенных і страхавых фондаў і размеркаванне даходаў па працадзнях. Заканчваем падрыхтоўку да зімоўкі.

На праводзімых зараз перавыбарах советаў мабілізуем калгаснікаў і аднаасобнікаў на далейшае ўмацаванне дасягнутых выгнікаў за большэвіцкае завяршэнне ўсіх гаспадарча-палітычных задач і лепшую падрыхтоўку да новага сельскагаспадарчага года з тым, каб Менскі раён і ў далейшым пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і т. Гікало быў у ліку перадавых раёнаў рэспублікі.

Сакратар Менскаго КП(б)Б РЫСКІН.
Старшыня Оргбюро РВК ТУРЭЦКІ.
Нам. нач. палітаддзела 1-й МТС ГЕЧІН.
Нам. нач. палітаддзела Большэвіцкай МТС ПАЛЯКОЎ.

БЫЦЬ У ПЕРШЫХ РАДАХ!

Даб'ем права быць у першых радах фабрычнай калоны Окцябрскай дэманстрацыі — такую задачу паставілі рабочыя кожнай брыгады, кожнага цэха швейнай фабрыкі «Окцябр».

Заваяванне гэтага права праходзіць пад знакам соцспаборніцтва на выкананне і перавыкананне вытворчай праграмы. У выніку ёсць значны зрух у рабоце. Другі цэх (абедзве змены) з 1 да 28 кастрычніка выканаў свой план на 101,8 проц. Зніжана колькасць браку і перапрацовак.

Лепшымі брыгадамі з'яўляюцца 52 і 30 фасоны. Брыгада 52-га фасона за 25 дзён кастрычніка выканала праграму на 105,2 проц. Перапрацовкі складаюць 0,1 проц. замест дапускаемых па плану 0,5 проц. Брыгада 30-га фасона выканала план на 106,8 проц. Браку і перапрацовак няма.

На фабрыцы арганізаван культурна-бытавы паход. Абвешчан конкурс на лепшую культурную кватэру. Сёлмі фабрыкі адрамантавана 58 кватэр лепшых ударнікаў (Манусевіч, Одэрэух, Капялевіч, Кізнер і інш.). Яшчэ 70 кватэр зна ходзяцца ў рамонце. Усяго адпушчана на рамонт кватэр 13.000 рублёў, 5.000 штук цэглы, 8 яшчыкаў шкла і інш.

М. Я.

15 ТОН МЫЛА ЗВЫШ ПЛАНА

ГОМЕЛЬ, 29 кастрычніка. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Парфюмерна-мыльны завод у Новабеліцы (дырэктар Дрыц, парторг Розін, старшыня заўкома Шапіра) 27 кастрычніка выканаў гадавую праграму на 114 проц. і прыступіў да выканання дадатковай праграмы. Калектыў рабочых і ІТР абавязаўся закончыць гэту праграму да 25 снежня і даць у фонд з'езда советаў звыш дадатковай праграмы 15 тон мыла.

На заводзе імя Ланцуцкага закончана будаўніцтва і абсталяванне новага механічнага корпуса. Адрамантаваны і прыведзены ў прыгожы вигляд чырвоныя куткі. Рад цэхаў — галёшны, дрэваапрацоўчы — датэрмінова выканалі кастрычніцкую праграму.

На заводзе Гомсельмаш да 17-й гадавіны Окцябра заканчваецца пабудова і абсталяванне дзіцячых яслей.

ПАЛЯШЧУК.

ПЛАН ВЫКАНАН ДАТЭРМІНОВА

ВІЦЕБСК, 29 кастрычніка. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

У результаце пераходу да 1-га лістапада даць звыш плана прадукцыі на 50 тыс. руб.

У гэты-ж дзень к 4 гадзінам дня таксама выканалі кастрычніцкі промфінплан на 100,4 проц. рабочыя гонтава-мэблевай фабрыкі. Рабочыя абавязаліся да 20 снежня датэрмінова выканаць гадавы промфінплан.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ПЕРАТВАРАЮЦЦА У ЖЫЦЦЕ

ПОЛАЦК, 29 кастрычніка. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Рабочыя вагоннага дэпо абавязаліся да XVII гадавіны Окцябра выпусціць звыш плана з капітальнага рамонту 10 вагонаў і 6 вагонаў з аварыйнага рамонту. Ужо выпушчана звыш плана 6 вагонаў з аварыйнага рамонту і 2 з капітальнага.

НЕЙДЛІН.

ПАДРЫХТОЎЧАЯ РАБОТА У МЕНСКУ

Па Менску разгарнулася падрыхтоўка да перавыбараў гарадскога совета.

На заводах «Большэвік», імя Молатава, на фабрыках «Окцябр», імя Кагановіча, хлебакамбінаце праведзены злёты і сходы маладых рабочых, якія ў гэтым годзе ўпершыню ўдзельнічаюць у перавыбарах. На гэтых сходах старыя рабочыя дзяліліся вопытам совецкай работы. Моладзь узяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па падрыхтоўцы да перавыбараў.

На радзе прадпрыемстваў пачалася ўжо справаздачы рабочых дэпутатаў горсовета перад выбаршчыкамі. Такія справаздачы праведзены на фабрыцы «Окцябр», на заводах «Комунар», імя Варашылава, імя Молатава, імя Мяснікова і іншых.

Прадпрыемствы, якія шэфствуюць над чыгункай, праводзяць сумесныя вечары з рабочымі-чыгуначнікамі.

Завод імя Молатава рамантуе 10 кватэр рабочых, якія жывуць у дамах жактаў. Адрамантаваны заводскія інтэрнаты і рамантуюцца 5 стандартных заводскіх дамоў. Фабрыка імя Кагановіча ўжо адрамантавала 5 кватэр і на днях заканчваецца рамонт яшчэ трох.

ВЫБАРШЧЫКІ АТРЫМАЛІ ПОЗВЫ

МАЗЫР. (Ад палескага карэспандэнта «Звязды»).

25 кастрычніка пачалася справаздачная кампанія сельсоветаў. На сходах выбаршчыкаў у вёсках і калгасах разам з дэпутатамі робяць справаздачы і прэзідыумы сельсоветаў.

Актыўнасць калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў значна ўзнялася. Яўка выбаршчыкаў на справаздачныя сходы ў асобных сельсоветах (Тварычэўскі, Бабрынецкі, Сладабскі) складае 90-95 проц.

Выбаршчыкі прымаюць актыўны ўдзел у абмеркаванні работы дэпутатаў і прэзідыумаў сельсоветаў. У вёсцы Булаўкі (калгас імя Макса Гельца) па справаздачы старшыні сельсовета выступіла ў спрэчках 19 чалавек, у вёсцы Тварычэўка — 23 чал.

Справаздачная кампанія суправодзіцца масавым прылівам у калгасы аднаасобнікаў. За апошнія два тыдні ў раёне арганізаваны тры новыя калгасы. Прыліў аднаасобнікаў у старыя калгасы складае больш 300 гаспадарак.

1 лістапада ў раёне пачнуцца выбары новых дэпутатаў у сельсовет прыгараднага Баброўскага сельсовета. Выбаршчыкі ўжо атрымалі позвы аб яўцы на выбарчыя сходы.

ФРАЛОЎ.

ПАДРЫХТОЎКА РАЗГОРТВАЕЦЦА

ГОМЕЛЬ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

На заводзе «Рухавік рэволюцыі» адбыўся партыйна - комсамольскі сход па пытанню падрыхтоўкі да правядзення справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў. Рабочыя і дэпутаты горсовета адчыталіся перад сябрамі выбаршчыкамі.

Заводскія арганізацыі накіравалі рабочую брыгаду ў падшэфны сельсовет для аказання практычнай дапамогі ў правядзенні перавыбараў советаў.

Палітаддзел чыгуначнага вузла сумесна з горсоветам правялі агульны сход усіх рабочых старых кадравікоў чыгуначнага вузла па пытанню перавыбараў советаў.

У Бабовіцкім сельсавеце за час падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчай кампаніі советаў 42 аднаасобнікі падалі заявы ў калгас. Зараз праводзяцца справаздачы адказных членаў сельсовета аб іх рабоце перад выбаршчыкамі. 1 лістапада пачынаецца справаздачная кампанія сельсовета.

Калгас «Большэвік» рыхтуецца дастойна сустрэць 17-ю гадавіну Окцябра і перавыбары советаў. Ён поўнасцю і датэрмінова разлічыўся з дзяржавай па хлебу, бульбе, малаку. Мяса завезена авансам на 1935 год каля 10 цэнт.

ПАЛЯШЧУК.

ПЛАН ВЫКАНАН ДАТЭРМІНОВА

ВІЦЕБСК, 31 кастрычніка. (Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»).

Лесазавод імя «Правды» 28 кастрычніка датэрмінова выканаў кастрычніцкую праграму па 100,5 проц. 29 кастрычніка скураавод выканаў план на 106,5 проц. у натуральным выразе і на 102,2 проц. у цэнавым.

ЗАРУБЕЖНЫ.

СЁННЯ ПАЧАТАК ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ ВЯСКОВАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Райкомы, палітаддзелы, парткомы, парторгі! Акружыце ўвагай партыйныя школы, забяспечце высокую якасць іх работы з першага дня заняткаў

НЕВЫКАРЫСТАНЫ ВОПЫТ

(Ад Магілеўскага карэспандэнта «Звязды»).

Вялікі зал Магілеўскага педінстытута ледзь-ледзь змог змясціць у сябе ўсіх тых, хто жадаў прысутнічаць на гарадской канферэнцыі слухачоў і прапагандыстаў школ партыйнай асветы.

На гэтай канферэнцыі не было агульных дакладаў. Яна пачалася «спрэчкамі», выступленнямі з месц сакратароў парткомаў, прапагандыстаў, слухачоў і раённых кіруючых работнікаў.

Асаблівую ўвагу звярнулі на сябе выступленні лепшага прапагандыста шаўковай тав. **Шэвелева** і сакратара парткома гэтай фабрыкі тав. **Драбінскага.** Яны расказалі канферэнцыі аб багатым і каштоўным вопыце арганізацыі партыйнай вучобы ў сябе на прадпрыемстве.

Пачалі тут падрыхтоўку да новага навучальнага года яшчэ ў жніўні і пачалі з прапагандыстаў. Да пачатку заняткаў партком забяспечыў усе гіколы сваімі прапагандыстамі.

Школы былі ўкамплектаваны да першага верасня. З гэтага часу да пачатку заняткаў прапагандысты атрымалі задавальненне азнаёмліцца са складам сваіх слухачоў—з іх работай на вытворчасці, з іх удзелам у грамадскай рабоце, з іх бытавымі ўмовамі.

Пасля таго, як заняткі ў школах пачаліся—а з 3 кастрычніка—партком, па прыкладу партарганізацыі метро, заслухаў па сваім пасяджэнні школу спачуваючых, прычым не даклад кіраўніка або парторга, а ўсю школу слухачоў і кіраўніка. Гэта былі своеасаблівыя падагульняючыя заняткі ў прысутнасці парткома.

Гэта форма праверкі школ дала бліскучыя вынікі.

Найбольш цікавым і новым у рабоце парткома са школамі і комуністамі наогул з'яўляецца тое, што ён настойліва ўкараняе ў хату кожнага комуніста кніжку. Пачалося гэта з таго, што партком усім комуністам выдаў зборнік з рашэннямі XVII з'езда партыі, а многім —«Пытанні ленінізма». Пасля ўсе члены парткома хадзілі па кватэры да комуністаў і знаёміліся з іх хатнімі бібліятэкамі. Праверка паказала, што ў многіх членаў і кандыдатаў партыі ёсць невялікія «бібліятэкі» палітычнай літаратуры. А вось белетрыстыкі, як правіла, няма.

Тады рашылі закупіць кніжкі, вылучыць тройку, якая-б на аснове персанальнага падыходу да кожнага комуніста забяспечыла іх бібліятэчкамі. Гэта рашэнне ўжо ў значнай ступені выканана. Закуплена каля 2000 розных кніжак і ўкамплектавана 60 бібліятэчак.

Сюды ўвайшлі кнігі **Маркса, Леніна, Сталіна,** мастацкая літаратура—кнігі **Даніеля Дэфо, Купалы, Гарбатава, Лыньксва, Ільіна, Л. Талстога, Леонава, Ясенскага, Н. Тіханава** і т. д.

Далёка не так абстаіць з іншымі школамі горада. Цяга да вучобы ёсць, але арганізацыя вучобы не вельмі добрая. Пры РК КП(б)Б ёсць комвуз і СПШ. Заняткі яны пачалі 15 верасня. Але, скажам, у СПШ тады займалася 60 чал., а цяпер 105. Кожны дзень—прырост і адсеў. Цікучасць не дае добра і паслядоўна асвойваць праграму. Тое-ж і ў комвузе. Як правіла, гэтыя школы займаюцца кожны раз у другім пакоі, наглядных дапаможнікаў няма.

Яшчэ горш з семінарам прапагандыстаў. Вось што гаворыць кіраўнік семінара па гісторыі партыі тав. **Рабіновіч:**

—На семінар павінны прыходзіць 20 чал., а прыходзіць толькі 3-4. Прычым сёння адны, а заўтра другія.

Амаль ва ўсіх школах скардзяцца на недахват падручнікаў. Няма геаграфічных карт, глобусаў. Не прымяняюцца проекцыйныя ліхтары.

РК КП(б)Б трэба вопыт шаўковай зрабіць здабыткам усіх пізавых партарганізацый раёна.

В. ДАЛЬ.

Дырэктар скуразавода «Большэвік» тав. Бандарчык і сакратар парткамітэта тав. Гефан правяраюць якасць скуры.

КАНФЕРЭНЦЫЯ СЛУХАЧОЎ ПАЛІТШКОЛ ВІЦЕБШЧЫНЫ

У малую залу клуба панчошніц групамі і па аднаму прыходзілі слухачы партшкол. Звыш 1.000 чалавек прышлі ў клуб, каб падвесці вынікі першых дзён сваёй вучобы, абмяняцца вопытам, калектыўна выпрацаваць новыя мерапрыемствы па паляпшэнню якасці вучобы.

Першым атрымлівае слова сакратар партыйнага камітэта фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» т. **Рохкінд.** Партарганізацыя фабрыкі ў гэтым годзе займае першае месца па ўсіх відах партыйнай вучобы.

Падрыхтоўчая работа, — гаворыць т. Рохкінд,—пачалася яшчэ ў жніўні. Пры камплектаванні школ выхо[illegible] газоўным чынам з агульнаа[illegible]нага і тэарэтычнага ўзро[illegible]нага слухача. З 268 чалавек, [illegible] арганізацыі вучобай ахоплены 231 чалавека. Не ахоплены вучобай 36 чалавек хворых і знаходзячыхся ў камандыроўцы.

—У адрозненне ад мінулага года прапагандысты, за выключэннем двух чалавек, падабраны з кіруючага партактыва фабрыкі, чрашоўшыя праверачную камісію пры гаркоме партыі. Фабрычныя прапагандысты лепш ведаюць людзей, знаёмы з умовамі іх работы і ўмеюць да слухачоў лепш падыйсці. Школы забяспечаны чыстымі, светлымі, добра абсталяванымі памяшканнямі. Ёсць неабходны дапаможны матэрыял (рознастайныя падручнікі, геаграфічныя карты, сшыткі, алоўкі і інш.).

Метады сацыялістычнага спаборніцтва ўкаранены ў вучобу. Спаборнічаюць групы з групамі і асобныя слухачы паміж сабой. У групах сістэматычна выходзяць насценныя газеты. Партком прэміраваў 15 лепшых ударнікаў вучобы. Прыступлена да арганізацыі партыйнага габінета.

На канферэнцыях выступалі прадстаўнікі партыйных арганізацый «Чырвонага металіста», «КІМ», «Дзвіны» і інш. На заводзе «Чырвоны металіст» партвучоба ў гэтым годзе фазгарнулася непаўрэальна лепш, чым у мінулыя гады. Заняткі адбываюцца ў чыстых, добра прыстасаваных пакоях клуба. Многа таварышоў займаецца на даму. Праводзіцца індывідуальнае спаборніцтва слухачоў на лепшую пастаноўку вучобы. Сістэматычна выпускаецца 12 насценных газет. Шмат прапагандыстаў, як і на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі», з ліку свайго партактыва.

Да недахопаў неабходна аднесці яшчэ няпоўны ахоп вучобай усіх членаў арганізацыі. З 137 чалавек 14 вучобай яшчэ не ахоплены.

Горш абстаіць справа на панчошнай фабрыцы «КІМ». Паміма таго, што 18 чалавек вучобай яшчэ не ахоплена, наведванне тут таксама слабае. У школе спачуваючых наведванне складае 78 проц., у іншых школах—88-90 проц.

Фабрыка імя **Гірша Лекерта** фігуравала на канферэнцыі з адмоўнага боку. Улік наведвання і паспяховасці слухачоў адсутнічае. Людзі займаюцца ў халодных памяшканнях, зусім непрыстасаваных да заняткаў. Падручнікі ляжаць у партгабінеце, слухачам на рукі не выдаюцца. Ёсць шмат прагулаў.

Прымушае біць трывогу выступленне дырэктара вячэрняга комвуза тав. Фішмана. З 500 слухачоў комвуза 140-150 чалавек сістэматычна пропускаюць заняткі. Адміністрацыя комвуза не раз аб гэтым паведамляла партарганізацыі, але апошняя неабходных мер да прагульшчыкаў не прымае.

Канферэнцыя пастанавіла ў бліжэйшым часе паслаць у Ленінград і Маскву групу прапагандыстаў і слухачоў, каб пераняць лепшы вопыт партыйнай вучобы.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ

НА АРШАНСКІМ СХОДЗЕ СЛУХАЧОЎ ПАРТАСВЕТЫ

У перапоўненай зале Аршанскага кінотэатра адбыўся сход слухачоў гарадской партыйна-комсамольскай сеткі і прадпрыемстваў: **Асінторфа, БелДРЭС,** ільно і мясакамбінатаў і іншых прадпрыемстваў раёна.

Выступленне сакратара парткома Асінторфа т. **Жук** сход слухаў з асаблівай увагай. Партком Асінторфа з пачатку падрыхтоўкі да навучальнага года ўлічыў усе недахопы работы, партсоткі мінулага года. Пры камплектаванні, строга ўлічан узровень палітычнай падрыхтоўкі слухача.

Для кіраўніцтва партвучобай партком вылучыў добра падрыхтаваных комуністаў. Так, напрыклад, дырэктар Асінторфа т. **Войтаў** кіруе гуртком па вывучэнню ленінізма. Старшыня парткома т. **Баранаўскі** кіруе СПШ і інш. Лепшыя прапагандысты даны комсамольскай сеткі.

У першыя дні заняткаў былі спазненні. Партком устанавіў, што пасля кожных заняткаў старасты школ даюць весткі сакратару парткома т. Жуку аб ненаведваўшых і спазніўшыхся.

Тав. Жук асабіста з кожным гутарыць, выяўляе прычыны. Часта пытанне перакідваецца на абгаварэнне партыйнай групы. Спазненняў зараз няма. Ненаведванні змяншаюцца.

Асобныя парткомы не сур'ёзна падышлі да выканання дырэктыў ЦК аб партыйнай вучобе. На механічным заводзе заняткі партшколы зрываліся з-за розных пасяджэнняў. На БелДРЭС'е ненаведванні даходзяць да 50-70 проц. Партыйная сетка не прыстасавана да зменнай работы комуністаў.

Барацьба за якасць вучобы яшчэ не стала штодзённай у рабоце парткамітэтаў. У большасці школ адсутнічае ўвязка вучобы з практычнай работай слухачоў. Частка з іх не забяспечана поўнасцю літаратурай. Адсутнічае штодзённае кіраўніцтва і дапамога прапагандыстам. Не наладжана работа пропсемінараў.

На сходзе выявілася, што не ўсе партыйныя арганізацыі дапамагаюць комсамольскай палітвучобе. На ільнокамбінаце для комсамольскай палітсеткі было адведзена памяшканне без сталоў і крэслаў. Партарганізацыя РВК адмовілася даць кіраўніка для комсамольскай палітшколы пры наяўнасці ў арганізацыі падрыхтаваных комуністаў, здольных кіраваць школай.

***

У адносінах партасветы ў вясковай партарганізацыі мяркуецца арганізаваць тры месячныя школы-перасоўкі для комуністаў-адзіночак, школы пры калгасах,—усё гэта вельмі добра. Але ці сустрэне вясковая партарганізацыя першы дзень вучобы—1 лістапада ў баявой падрыхтаванасці,—гэта сказаць цяжка.

Аршанская партарганізацыя, паказаўшая большэвіцкія прыклады ў правядзенні гаспадарча-палітычных кампаній, абавязана і ў арганізацыі маркісцка-ленінскага выхавання быць у ліку перадавых.

ФРЫД.

ЎСЕ КОМУНІСТЫ ЗОНЫ ГОМЕЛЬСКАЙ МТС АХОПЛЕНЫ ВУЧОБАЙ

(Ад гомельскага карэспандэнта «Звязды»)

Да разгортвання партвучобы палітаддзел Гомельскай МТС (начальнік тав. **Валашынаў**) падрыхтаваўся не дрэнна. Усе комуністы і частка беспартыйнага калгаснага актыва ахоплены вучобай.

Дзень 1 кастрычніка быў першым днём партыйнай вучобы ва ўсіх калгасах зоны дзейнасці МТС. Усяго арганізаваны 24 першапачатковыя кандыдацкія школы і два гурткі па вывучэнню гісторыі ВКП(б). Ужо ў кожным калгасе працуе кандыдацкая школа, а ў двух калгасах — **«Чырвоны хлебарэб»** і **«Чырвоны маяк»,** — апрача кандыдацкіх школ створаны гурткі па вывучэнню гісторыі партыі.

У школах і гуртках навучаюцца 72 комуністы, 59 спачуваючых і больш 300 калгасных актывістаў.

Да прапагандысцкай работы прыцягнута большасць парторгаў. Для павышэння тэарэтычнага ўзроўню прапагандыстаў арганізован пропсемінар. Тры разы ў месяц усе прапагандысты збіраюцца на цэлы дзень для вучобы ў **Гомель** у дом партактыва.

Кожны прапагандыст атрымлівае невялічкую бібліятэчку, школа — дадатковую літаратуру апрача падручнікаў.

У двух калгасах абсталёўваюцца вопытна-паказальныя памяшканні для заняткаў школ. У часы заняткаў слухачы будуць атрымліваць гарачыя вячэры.

ПАЛЯШЧУК.

Ліст брыгады

КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ ТРЭБА ЎМЕЦЬ АРГАНІЗАВАЦЬ

„Калгаснік на варце"—орган Лельчыцкага РК і РВ

Лельчыцкі раён займае адно з апошніх месц у Беларусі ў адносінах калектывізацыі. Нават зараз, калі новая хваля калгаснага прыліву магутна ўзнялася амаль ва ўсіх раёнах БССР, у Лельчыцах прыток вельмі нязначны. Але раённую газету «Калгаснік на варце» мала турбуе гэта справа. Яна спадзяецца на самацёк і лічыць, што справа з калектывізацыяй у раёне зусім не дрэнная. Аддаючы даніну дню ўраджаю і калектывізацыі перадавым артыкулам, газета хваліцца «дасягненнямі»:

«Арганізован нядаўна ў Грабянеўскім сельсавеце новы калгас імя Варашылава, уступіла 12 гаспадарак у калгас «Новая ніва», прыліў на 26 гаспадарак у калгасе «Шосты з'езд советаў». Магутны калгасны прыліў па цэлым ряду іншых калгасаў раёна яшчэ раз сведчыць аб тым, што значная частка працоўных аднаасобнікаў усвядоміла шлях калгасаў».

(№ 87 ад 13 кастрычніка).

Узнікае пытанне, дзе-ж ён, гэты «магутны прыліў», аб якім гаворыць газета, калі на працягу ряду гадоў раён топчацца на месцы ў адносінах калектывізацыі, калі на 1 кастрычніка 1934 года тут толькі 39,5 проц. сялянскіх гаспадарак у калгасах у той час, як у сярэднім па БССР процант калектывізацыі роўна 62.

Замест таго, каб супакойваць сябе і другіх, што «значная частка працоўных аднаасобнікаў усвядоміла шлях калгасаў», газета павінна была-б з большэвіцкай праматой паставіць пытанне аб тым, **што яшчэ больш значная** частка працоўных аднаасобнікаў раёна ўсё яшчэ не ўсвядоміла шляху калгасаў і што віна за гэта падае перш за ўсё на раённыя арганізацыі, у тым ліку і на раённую газету.

Мы ведаем, што перамога не прыходзіць сама, яе трэба арганізаваць. Але што зрабіў «Калгаснік на варце» для арганізацыі калгаснага прыліву?

У тым-жа артыкуле да дня калектывізацыі і ўраджаю газета заяўляе, што «перадавыя калгасы раёна шчыльна падыйшлі да заможнага жыцця». Хто, як не газета, павінен быў-бы арганізаваць паказ аднаасобнікам гэтага заможнага жыцця калгасаў. Варта хоць крыху праявіць ініцыятывы і можна было знайсці дзесяткі арганізацыйных форм, каб давесці да свядомасці аднаасобнікаў поспехі калгасаў. Можна было арганізаваць выступленні калгаснікаў, як прышлі яны да заможнага жыцця, і прапрацоўку гэтых выступленняў у аднаасобных вёсках з удзелам аўтараў гэтых выступленняў. Можна было правесці справаздачы перадавых калгасаў у аднаасобных вёсках аб сваёй рабоце. Дзесяткі спосабаў паказаць жывое жыццё перадавых калгасаў, узяла-б, калі-б хапела, знайсці газета. Але «Калгаснік на варце» не цікавіўся гэтым пытаннем. Ён не скарыстаў мацнейшай зброі агітацыі—**паказу дасягненняў.**

Работай і жыццём аднаасобніка газета таксама не займаецца. Пытанне аб аднаасобніку ў газеце зводзіцца выключна да бяззубых заклікаў «падцягнуцца» і да агульных абвінавачанняў у сабатажы («Вёска(?) Забалоцце сабатуе хлебапастаўкі» — загаловак у нумары ад 13 кастрычніка і інш.). Як жыве аднаасобнік, з якімі вострымі пытаннямі, перашкаджаючымі яму стаць на шлях арцельнага жыцця, ён сутыкаецца на сваім шляху — гэта газету не цікавіць. Калі нават бываюць выпадкі, што на старонках «Калгаснік на варце» ўспліваюць факты, якія кідаюць святло на адносіны да аднаасобніка ў раёне, то газета не ўмее (або не хоча) іх асмысліць і падняць на прынцыповую вышыню. У № 87 у заметцы на 4-ай старонцы каля аўтарытэтнага подпісу рэдактара газета паведаміла, што ў Сянь-Польсім (самым адстаючым совеце:

«Не праводзіцца ніякай культурна-растлумачальнай работы і неадварот палітыка штрафаў набыла мясавы характар».

Хто вінават у гэтай «палітыцы штрафаў», у чым шкодласць гэтай палітыкі і якія яе рэзультаты — гэта газету не цікавіць. Канстатаваўшы факт, яна забывае аб ім. У другім месцы (№ 74 ад 4 верасня) газета паведамляе, што Лельчыцкі сельсавет, які складаецца, галоўным чынам, з аднаасобнікаў, натурае ўтойванню пасеваў і незаконна эпіжае нормы хлебапаставак.

Гэта справа выключнай важнасці, якая праліває святло на метады барацьбы класава-варожых элементаў супроць калектывізацыі, зразумела, варта таго, каб газета грунтоўна занялася ёю і давяла да канца. Але «Калгаснік на варце» глядзіць інакш. **Ён паведаміў факт і прайшоў міма.** Няхай лельчыцкі сельсавет прадаўжае сваю злачынную справу. «Калгаснік на варце», як панамар, адзваніў і з званіцы далоў.

Газета забыла, што яе абавязак згуртоўваць масы, арганізоўваць іх на выяўленне класавага ворага, які дзейнічае «ціхай сапай», і на барацьбу з ім.

4 кастрычніка газета дала перадавую аб мэтах і задачах вытворчага паходу імя VII з'езда советаў. Яна добрасумленна пералічыла ўсе задачы, якія стаяць перад раёнам, — вялікія і малыя. **І толькі адна задача выпала з яе поля зрэку — гэта барацьба за калектывізацыю, работа з аднаасобнікам.**

Мы напамінаем «Калгаснік на варце», што яго непасрэдны абавязак скарыстаць перавыбары советаў для арганізацыі калгаснага прыліву. Наглядна паказаць выбаршчыкам, чаго мы дабіліся ў сельскай гаспадарцы, куды вядзе вёску совецкая ўлада; падняць масы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў на выкрыццё недабітага класавага ворага; на аснове большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі прарываў і недахопаў, на аснове паказу дасягненняў калгасаў дабіцца яшчэ большага збліжэння паміж калгаснікамі і працоўнымі аднаасобнікамі — гэта значыць расчысціць аднаасобніку дарогу ў калгас.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

СТАРШЫНІ СТАРОБІНСКАГА РВК тав. МАХНАЧУ.

„ЗААХВОЧВАННЕ" УДАРНІКАЎ У СТАРОБІНЕ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА-УДАРНІКА).

Я ўступіў у калгас у 1929 годзе. Абагуліў усю сваю маемасць. Но гледзячы на старасць (мне 65 год), я выпрацаваў 250 працадзён.

Праўленне калгаса «Лепшая раніца» за маю работу залічыла мяне ўдарнікам. Але гэта толькі на паперы. На справе-ж да мяне адносяцца як да самага злоснага лодыра. Звярнуўся я да праўлення калгаса з просьбай даць мне кватэру. І вось далі хатку без вокан, без падлогі, без кладовай, дзе можна-б было палажыць запрас бульбу і іншыя прадукты. Прыдзеш з работы, няма дзе адпачыць.

Няўжо я сваёй ударнай работай не заслужыў права на нармальныя ўмовы жыцця і адпачынку?

ЯРМАЛОВІЧ.

САКРАТАРУ ВІЦЕБСКАГА ГК КП(б)Б тав. ЖУРАЎЛЕВУ.

У ВІЦЕБСКУ НЯМА ЎВАГІ ПЛАНЕРЫЗМУ

(ПІСЬМО ПЛАНЕРЫСТА).

У верасні гэтага года 11 чалавек, скончыўшых менскую планерную школу, накіравалі ў г. Віцебск для арганізацыі гурткоў планерыстаў на прадпрыемствах.

Дырэктары раду прадпрыемстваў свядома перашкаджаюць у гэтым. Дырэктар фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі» т. **Халапкоў,** фабрыкі «КІМ» — т. **Мазья,** «Дзвіна» — т. **Каплан** адмовіліся нават даць памяшканне для хавання планера, заявіўшы: «Наша справа промфінплан, а не планерызм».

Но садзейнічаюць пастаноўцы планернай вучобы і комсамольскія арганізатары завода «Чырвоны металіст» Есяндзюў, лесазавода Іофе, фанернай фабрыкі — Левін.

КАУМІКОЎ.

НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА ВЫСВАЧАНСКАЙ МТС тав. СТРОНГІНУ.

ТРАКТАРЫСТАМ НЕ ВЫПЛАЧВАЮЦЬ ГРОШАЙ

(ПІСЬМО ТРАКТАРЫСТАЎ).

Мы, трактарысты Высачанскай МТС, яшчэ да гэтага часу ні капейкі не атрымалі за работу часе веснавой пасеўнай і ўборачнай кампаніі.

Наступілі халодныя дні, а ў нас няма за што купіць абутак, вопратку. Бухгалтэрыя заблытала ўчот і мы не ведаем, колькі хто з нас выпрацаваў.

Няма цёплага памяшкання, дзе-б можна было пачаваць. Спім на сенавалах.

Газет нам не выпісваюць, кінокарцін на ўчастку, дзе мы працуем, не прывозяць.

ХАХЛОЎ, НОВІКАЎ І ШАРАМЕЦЕЎ.

СТАРШЫНІ РАГАЧОЎСКАГА РВК тав. ЗЯЛЕНКА.

АДЗІНАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА І ТОЕ РАЗВАЛЕНА

(ПІСЬМО ЧЫРВОНААРМЕЙЦА).

У Азяранскім сельсавеце (Рагачоўскі раён) было адзінае прадпрыемства — млын з крупадзёркай, лесапільным цэхам і сукнавалкай.

На вачах сельсаветскіх і раённых арганізацый гэтае прадпрыемства зусім развалена. Дзверы і вокны выбіты. Каштоўныя часткі ад машын раскрадваюцца.

АБРАМЕНКАЎ.

ПА СЛЯДАХ АПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

«Звязда» ў № 211 ад 21 верасня змясціла пісьмо курсантаў гідраметэралагічнай службы БССР Чарняўскага, Наўменкі, Шылай і інш. аб агідным становішчы інтэрната курсаў.

Кіраўніцтва гідраметэралагічнай службы паведамляе, што факты пацвердзіліся.

За антысанітарнае становішча інтэрната і адсутнасць штодзённага нагляду загадчык курсаў тав. Барысёнка з работы знят. Пам. начальніка гаспадарчай частка тав. Трыбунцу абвешчана вымова.

***

У змешчанай у газеце («Звязда» за 17-IX) заметцы пад загалоўкам «Мельцынская дапамога за хабар» указвалася, што фельчар цараўскага медпункта — былы кулак — лічыў хворых толькі за хабар.

Слуцкі РВК паведамляе, што факты пацвердзіліся. Фельчар Філіповіч з работы знят, справа перадана ў суд.

Закупкі хлеба

ТОЛЬКІ... 17 КІЛОГРАМАЎ

У пратаколах РВК і райсаюза запісаны прыгожыя рэзалюцыі аб правядзенні работы па закупках хлеба. У пратаколах парады партыйнага актыва таксама запісана, што «па ходу хлебазакупак будзе меркавацца аб боездольнасці партарганізацыі змагацца за выкананне важнейшых дырэктыў партыі».

У Крупскім, як і ў іншых раёнах, у сельсоветы і калгасы былі пасланы ўпаўнаважаныя РК і РВК.

Калгаснікі—народ арганізаваны, яны з ахвотай адгукнуліся на пастанову партыі і ўрада і прадалі свае лішкі дзяржаве. Упаўнаважаныя ўсю сваю ўвагу сканцэнтравалі на эканомічна моцных калгасах. У першыя дні арганізацыі закупак хлеба да сельпо рухаліся чырвоныя абозы з хлебам. Старшыня райсаюза тав. **Флейшар** сядзеў у канторы, падбіваў на лічыльніках кілограмы і атрымліваў тоны:

— Ну, здаецца, сёння топ дваццаць закупілі,—самазадаволена заўважыў Флейшар.

Прайшоў месяц. Раён закупіў 205 тон—прыблізна палову таго, што меркавалася закупіць. Супакоіўшыся на дасягнутых поспехах, у раёне спынілі арганізацыйную работу па закупках хлеба.

Хацюхоўскі, Халопеніцкі, Узняцкі сельсоветы прадалі дзяржаве ў 1,5—2 разы больш хлеба, чым меркавалася. Але затое Жыберыцкі, Заборскі, Пацкі, Сакаловіцкі сельсоветы амаль нічога не закупілі. Шынкаўскі сельсавет за ўвесь час арганізацыі хлебазакупак закупіў толькі... 17 кілограм хлеба.

Раённыя арганізацыі абыякава глядзяць на такія агідныя факты. Яны не лічаць патрэбным рэагаваць на бяздзейнасць з боку многіх старшынь сельсоветаў і сельпо.

Уся сістэма спажывецкай кааперацыі закупкамі хлеба не займаецца, у лепшым выпадку яна толькі прыблізна ўлічвае паступаючы хлеб.

Сярод аднаасобнікаў ніякай растлумачальнай работы не праведзена. Аднаасобнікі Хальнівіцкага, Сакаловіцкага, Жаберыцкага і Заборскага сельсоветаў да гэтага часу не прадалі ні аднаго кілограма хлеба.

У дэкларацыйнасці, адсутнасці большэвіцкай барацьбы з класава-варожымі элементамі ў самасупакаенні раённых кіраўніцтваў, у адсутнасці масавай работы галоўная прычына спынення закупак хлеба ў Крупскім раёне.

ІВАШЫН.

УЛІЧВАЦЬ РУХ ТАВАРАЎ ХЛЕБНАГА ФОНДУ

Да гэтага часу Белкаапсаюз не арганізаваў уліку расходвання тавараў хлебнага фонду. Мы ўжо прыводзілі рад фактаў разбазарвання тавараў на мясцах, асядання іх на базах райспажыўсаюзаў і сельпо.

Калі мы прабавалі даведацца ў загадчыка гандлёвага кіраўніцтва Белкаапсаюза тав. Каструлёва, як прыбылі ў райсаюзы адружаныя тавары і як гэтыя тавары там скарыстоўваюцца, тав. Каструлёў на гэта адказаць не мог, матывуючы тым, што гандлёвае кіраўніцтва адказна толькі за разнарадку і хутчэйшую адгрузку.

Другі намеснік начальніка Хлебагандля БКС тав. Лесін, на абяцанку якога ляжыць сачыць за правільным скарыстаннем тавараў, таксама гэтай справай не займаецца. Ён заяўляе, што такі ўлік завесці неабходна, але да гэтага часу не дагадаўся і з 1 лістапада. Ён безумоўна будзе адказ аб расходванні тавараў.

ДА XVII ГАДАВІНЫ ОКЦЯБРА

ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ СТАРОЙ І НОВАЙ ВЁСКІ

На неабсяжных абшарах вялікай нашай краіны творацца дзеі і учынкі, аб якіх ведае ўся краіна, уся зямля Советаў. Іх твораць людзі, аб якіх пішуць газеты, партрэты якіх аздабляюць нашы клубы, паркі, сады, хаты-чытальні. Ёсць тысячы людзей, слаўныя ўчынкі якіх перарастаюць у легенды. З вялікім напружаннем сочыць за імі ўся краіна. З вялікай любоўю і павагай вымаўляюць іх імёны.

Слаўныя чэлюскінская эпапея, пратрымеўшая на ўвесь свет, і непрыкметны ўчынак 8-гадовага хлапчука папярэдзіўшага крушэнне поезда; сусветны рэкорд па зацяжному прыжку з парашутам з вышыні 8.000 метраў і непрыкметны ўчынак старога калгасніка-вартаўніка, які не сышоў са свайго паста, вартуючы калгаснае дабро, калі гарала яго хата, падпаленая кулакамі. Ад аднаго ўчынку да другога—велізарнейшыя адлегласці і разам з тым яны стаяць побач, бо іх твораць людзі, прасякнутыя адной думкай, адным жаданнем—быць адданым пабудове социялізма, быць адданым нашай вялікай радзіме.

Гэта знатныя людзі нашай краіны.

Аб людзях, якіх ведаюць нямногія, аб людзях, якія твораць непрыкметную, але вялікую справу, аб знатных людзях калгасных палёў гэта апавяданне.

Выклік

У сакавіку гэтага года, калі вясна ўжо давала аб сабе знаць, позна ўвечары ішоў па вясковай вуліцы **брыгадзір другой брыгады калгаса «Верны шлях да социялізма», (былая вёска Баранькі) Аршанскага раёна, Якім Кананкоў.**

Зыбкі снег распаўзаўся пад яго нагамі. Была адліга. У цёплым пасля моцных марозаў подыху ветра чулася набліжэнне вясны. Якім Кананкоў не заўважаў гэтага. Ён быў ўсхваляваны.

Каля хаты брыгадзіра першай брыгады Гурчанова ён спыніўся, крышку падумаў і рашуча ўзяўся за клямку дзвярэй.

Праз хвіліну ён уваходзіў у хату Гурчанова і, хмурачыся на святло лампы, рашуча і моўчкі падыходзіў да гаспадара. Не спяшаючыся, дастаў з кішэні кавалак паперы, акцярожна разгарнуў яго на стале, разгладзіў далонню і ўсхваляванa сказаў.

— Я цябе, браце, не чапаў... Ты чапаў і ты мяне. Ты мяне першы выклікаў пры ўсім калгасе, то цяпер трымайся... На, чытай...

Не сказаўшы больш ні слова Гурчанову, ён павярнуўся і, не развітаўшыся, выйшаў з хаты. На стале астаўся спісаны ліст паперы. У ім было:

«Мы, калгаснікі, другой брыгады... Выклік першай брыгады прымаем і бярэм на сябе абавязкі»...

І далей ішоў пералік абавязкаў. Другая брыгада абяцала своечасова правесці верыва, ачысціць глебу, ачысціць і пратруціць насенне, скончыць сяўбу ў тэрмін, дабіцца высокай ураджайнасці—з аднаго гектара зняць не менш 14 цэнтнераў ільняніны, столькі-ж ячменю, увосень накапаць не менш 160 цэнтнераў бульбы з гектара, на правядзенне сяўбы не затрачаць ніводнага лішняга працадня, звыш устаноўленага планам, не зрабіць ніводнага прагулу ці спазнення ў час сяўбы...

Так другая брыгада намячала планы сваёй дзейнасці па кожнаму пункту. Дагавор падпісалі 7 лепшых калгаснікаў. Яны цвёрда і проста заявілі:

— Мы будзем змагацца як большэвікі.

* *

Пачалося-ж гэта са сходу.

Два дні таму назад у калгасным клубе больш за сотню людзей глядзелі ў твар Кананкову ў тыя хвіліны, калі брыгадзір першай брыгады Сцяпан Гурчаноў крыў Кананкова і яго брыгаду, як самую адстаючую ва ўсім калгасе.

Кананкоў сядзеў унурыўшыся, апусціўшы галаву. Кананкову было сорамна. І калі Гурчаноў зачытаў выклік першай брыгады на спаборніцтва з другой, Кананкоў падняў галаву і разгублена азірнуў прысутных. І чамусці яго позірк спыніўся на жонцы. Яна сядзела ўтыжка збоку. Вочы яе ўвесь час цільна пазіралі на Кананкова, яе мужа—адстаючага брыгадзіра адстаючай брыгады адстаючага калгаса.

Кананкоў крыху пачырванеў, хацеў усміхнуцца, але гэта ў яго не вышла. Ён адвярнуўся і перавёў позірк туды, адкуль гучэлі словы Гурчанова. І кожнае слова ўразалася ў памяць Кананкову.

Сакрэт Кананкова

Пачаліся будні, насычаныя працай, клопатамі, трывогаю...

Вясна была ў разгары. Калгаснікі ішлі ў наступ на палі. Брыгады спаборнічалі. Яны змагаліся за высокі ўраджай, які прынясе заможнае жыццё калгасу, яны змагаліся за кожны пункт дагавору на соцспаборніцтва. І кожны гэты пункт яны бралі з бою, як цытадэль.

Пры спатканні брыгадзіры Кананкоў і Гурчаноў падзаронна, з трывогай паглядалі адзін на аднаго, моўчкі разыходзячыся. Кананкоў не мог забыць таго вечара, калі яго «асароміў» Гурчаноў перад усім калгасам.

І Кананкоў цвёрда рашыў вывесці сваю брыгаду на першае месца. Канешне, нялёгка было прабівацца з адстаючых у перадавыя.

Шмат начэй не спаў Кананкоў, абдумваючы сакрэт перамогі.

— Ёсць-жа перадавыя калгасы, нават у нашым сельсавеце, ёсць,— разважаў Кананкоў.—А наш адстае.

Кожны дзень позна ўвечары прыходзячы з работы, Кананкоў садзіўся за стол і разважаў над недахопамі работы сваёй брыгады.

Галоўнае, што мучыла Кананкова —гэта пытанне, як паступіў-бы на яго месцы большэвік. Ён добра памятаў абяцанне сваёй брыгады:

— Мы будзем змагацца, як большэвікі.

Уласна кажучы, Кананкоў не зусім вырвана ўяўляў сабе як у такіх выпадках павінен рабіць сапраўдны большэвік.

Кананкоў пераканаўся, што адну і тую-ж работу можна рабіць дзень і можна рабіць паўдня. А багата часу марна прападае ад таго, што не кожны калгаснік ведае сёння што ён будзе рабіць заўтра. Ад таго шмат часу ідзе па размеркаванне работы паміж калгаснікамі. Раніца прападае. А гэтак рабілася ва ўсім калгасе.

Тады пачаў Кананкоў начамі, з алоўкам у руцэ, схіліўшыся над кавалкам паперы, вылічваць, прыкідваць, як-бы зрабіць так, каб ні адна мінута не прападала, як-бы расставіць людзей з брыгады так, **каб кожны, выходзячы раніцою на работу, ведаў свой абавязак.**

Неўзабаве Кананкоў дамогся таго, што раніцою, роўна праз пяць хвілін, кожны калгаснік яго брыгады ведаў падрабязна сваё дзённае заданне. Ад гэтага работа пайшла шчарней. З кожным днём тэмпы павялічваліся.

На брыгаду Кананкова перасталі касіць вочы ды паказваць пальцам. І заўважылі калгаснікі, што раніцою, пакуль людзі збіраюцца, пакуль размяркоўваюць работу, брыгада Кананкова ўжо ў полі.

Пачаў прыглядацца Кананкоў да кожнага калгасніка сваёй брыгады. Калі бачыў, што ў каго-небудзь не ладзіцца работа або той адае тэмпы, падыходзіў тады беспартыйны брыгадзір да беспартыйнага-ж калгасніка і ціха пытаўся:

— Ты большэвік ці не?

І работа ішла дружна і спорна. Кананкоў дабіўся чоткай, правільнай расстаноўкі сіл, ні адна мінута ў яго брыгадзе не трацілася марна. Кананкоў сам рабіў за траіх, паказваючы прыклад іншым, як трэба рабіць.

Ён быў поўны імкнення быць перадавым, апраўдаць тое званне, якое па яго пачыну ўзяла на сябе брыгада. І адначасна недзе ў глыбіні істоты хавалася некаторае ладарадства, калі бачыў, што яго брыгада выпярэджвае брыгаду Гурчанова. Не тое, каб ён радаваўся няўдачам свайго «праціўніка», але некаторая непрыязць да Гурчанова асталася з часу іх апошняга спаткання.

Неяк у часе веснавой сяўбы, увечары, яны спаткаліся ў клубе. Ужо к таму часу стала ясна, што другая брыгада ідзе наперадзе. Аб гэтым якраз гаварылі на сходзе. І цяпер Кананкоў ужо не сядзеў унурыўшыся, калі па яго глядзела сто пар вачэй. Ён сядзеў спакойна і рашуча глядзеў наперад. І калі міма праходзіў Гурчаноў, пільным, доўгім і ўрачыстым поглядам азірнуў брыгадзір другой брыгады Яўхім Кананкоў свайго сабрата.

Той адвярнуўся і, нахмурыўшы бровы, сказаў:

— Ну, што-ж, пабачым. Восень сваё пакажа... Скажаш «гоп» калі пераскочыш...

— Пабачым,—увесь усхамянуўшыся, адказаў Кананкоў.

На гэтым і разышліся.

Былая царква перабудавана у калгасны дом культуры. НА ЗДЫМКУ: унутраны від Дома соцкультуры.

Шлях Кананкова

Быў гарачы летні дзень...

Спелым коласам, залатымі хвалямі пералівалася жыта ў калгасным полі. Надыхбдзіла гарачая пара ўборкі.

Усё было прыведзена ў баявую гатоўнасць. Адрамантаваны жняяркі, падрыхтоваи інвентар. З дня на дзень чакалі пачатку гарачай пары—уборачнай.

І яна прышла. З вечара праўленне калгаса дало загад—заўтра пачаць жніво. Досвіткам вышлі брыгады ў поле.

Застракаталі жняяркі і закіпела работа. У першы-ж дзень брыгада Кананкова перавыканала норму. Некаторыя жнейкі давалі вялікае перавышэнне норм. Напрыклад, Таццяна Бокус выпрацоўвала замест нормы ў 14 сотых 20 сотых. Асабліва добра працавала першае звяно другой брыгады, якое ўвесь час перавышала норму. Але не адставала і першая брыгада.

Кананкоў з Гурчановым амаль што не гаварылі. Не было часу. Ад рання да вечара кіпела работа.

Здарылася гэтым летам бяда ў Кананкова. Здохла яго карова. Паспрабавала жонка галасіць па звычаю даўняму, ды супыніў яе Кананкоў:

— Не гаруй... Бяда-бядой, ды не трападзеш ты цяпер. У калгасе-ж ты, не адна. Будуць каровы, будуць і цяляты, усё будзе. Не тыя часы, вось што я цябе скажу.

* *

Дваццаць гадоў таму назад знатны чалавек нашай рэспублікі Яўхім Кананкоў, тады яшчэ хлапчук, з торбачкай у руках стаяў насярод хаты і разгублена пазіраў вакол. Голымі рэбрамі бярвенняў тырчэлі сцены, паделепаватымі вачыма глядзелі шыбы...

Скрыпнулі дзверы. Гэта прымусіла хлапчука азірнуцца. У хату ўвайшла маці. Слёзы ліліся з вачэй яе, старэчы твар маці дрыжаў.

— Сыночак мой родненькі... Прышла наша пагібель. Падохла наша кароўка...

Хацела яшчэ нешта сказаць маці, але змаўчала, нібы духу ёй не хапіла, нібы сціснуў яе хто за горла.

І стаяў будучы знатны чалавек нашай рэспублікі маўклівы і разгублены...

...І пайшла маці Яўхіма Кананкова па снезе вясковай вуліцы. Зайшла яна ў хату Давыда Савіцкага, валаснога старасты Бараньскай воласці—знатнага чалавека таго часу.

(Сённяшні Давыд Савіцкі,—гэта не той Давыд Савіцкі, што быў дваццаць гадоў таму назад. Сённяшні Савіцкі, калі ён яшчэ жыве, гэта рахманы стары. Сёння ён бачком пройдзе па калгаснай вуліцы, ды на печ.

А тады ішоў Савіцкі па вёсны, праз шыю старынскі ланцут вісеў, на грудзях медаль звяла, барада па ветру развівалася. Адной сваёй зямлі сорак дзесяцін Савіцкі меў ды арандаваў столькі-ж.

На паклоны сустрэчных людзей адказваў праз пяць чалавек шостаму, ды і тое пры ўмове, калі гэты шосты быў фальваркоўцам або ўраднікам. Калі-ж хто з бяднейшых сялян звяртаўся да яго з хадайніцтвам, валасны староста знарок перавозіў размову на іншую тэму. Так, калі ў яго прасілі дапамогі, ён адказваў разважаннем аб тым, што надвор'е мабыць зменіцца, а калі ў старасты пыталіся пра надвор'е, ён расказваў пра турэцкую вайну.

У той-жа час іншым смертным следваць свайму прыкладу старасты не дазваляў. Так, аднойчы, калі селянін з вёскі Гарбацэнічы ў адказ на запытанне старасты аб надвор'і адказаў яму на тэму аб тым, што валасны староста гэта ёсць помесь дурня з прыставам, валасны староста загадаў даць яму дзесяць розаг. Прыгавор старасты быў прыведзен у выкананне Ціханам Шышковым і Цімафеем Цімашковым. Праўда, Ціхан Шышкоў і Цімафей Цімашкоў былі падкуплены адказчыкам і таму больш білі на сцяне валаснога праўлення, чым на адказчыку).

У хаце Давыда Савіцкага весела гарэў камінок.

Адчыніўшы дзверы, маці перажагналася і кінулася ў ногі валасному старасце.

— Дзядзечка, родненькі... Пазыч вроцы... Кароўка-ж мая здохла. Пагібель нашая прышла.

Савіцкі паглядзеў на агонь, дзе булькала ў гаршках страва, і адказаў:

— Борщ хутка згатуецца...

...І пайшла старая маці далей па снезе вясковай вуліцы...

Толькі галава яе дрыжэла ад болю і старасці...

...На кухні бацюшкі айца Міколы сказалі ёй, што бацюшка ў сталовай.

(Бараньскі бацюшка айцец Мікола Шчэрба пад сваёй рызай пасіў каля дзесяці пудоў уласнага мяса. У ціхай глушы, сярод лясоў і азёр Беларусі, сярод вялікага саду, які ў тыя часы межаваўся з краем бору, выгадавалася гэткая туша.

Сорак авечак, сорак дзве дзесяціны лепшай зямлі ды чатыры кані мела «яго прэпадобіе».

Бор, курганы ды азёры пільнавалі яго спакой.

«Яго прэпадобіе» быў не дурань, калі выбіраў для сябе такую «епархію».

Бараньскі бацюшка быў чалавек «партыйны»—састаяў членам і арганізатарам саюза архангела Гаўрыла па Бараньскай воласці).

У бацюшкавай сталовай сядзеў госць. Гэта быў мясцовы карчмар Самусь Барысёнак.

(Самусь Барысёнак, бараньскі карчмар,—быў бліжэйшым сябрам «бацюшкі» па саюзу архангела Гаўрыла і па прафесіі. Яны ў двох,—адзін на споведзі, у сваёй установе, другі-за бутэлькай гарэлкі ў карчме—выпытвалі думкі сялян і потым прымалі меры... У імя архангела Гаўрыла... У некалькіх кілометрах ад Барані па гваздзільным заводзе і зараз яшчэ працуюць двое рабочых палітканаржан т. т. **Герановіч і Іван Кляўза, якія ў свой час паплаціліся пажыццёвай катаргай у выпіку адной з нарад гэтых двух сяброў).**

Маці пачарзе пакланілася кожнаму з паноў і пачала выказваць сваю просьбу.

І чула маці, як падвыпіўшы Самусь Барысёнак шаптаў пану:

— Гані яе... Да д'ябла... Справою не даюць культаі гэтыя.

Але бацюшка пад сваёй рызай нядарма насіў каля дзесяці пудоў уласнага мяса,—як і большасць таўстых людзей, ён быў «лагодным» чалавекам.

— Пачакай...—спыніў ён лемантуючую маці,—у цябе-ж, здаецца, сын ёсць?

Старое цела маці дрыжэла ад болю і старасці.

— Але-ж, але-ж... Ёсць, бацюшка... ёсць... хлапчук Якімка...

Бацюшка паскроб падбародак.

— Што-ж... Пазычу... Трэба быць хрысціянінам... Толькі няхай твой Якімка адпрацуе мне гэтыя грошы...

Маці пакланілася бацюшку.

Ужо змрок атуляў зямлю, як вышла маці з бацюшкавай хаты.

Недзе далёка на захадзе, далёкая палёнка снегу,—гасіла зарыва вячэрняга сонца.

...А раніцою Якімка, прытуліўшыся да дрэва, апошнім поглядам развітваўся з сваёю вёскаю.

Развітваўся з саламянымі хустачкамі страх і са старымі гумнамі,—і пайшоў туды, дзе ніднелася на ўзгорку вялікая белая царква і белы бацюшкаў дом за высокімі прысадамі.

...А недзе ў змрочнай хаце белі слёзы са старэчага твара няшчаснай маці...

Так будучы знатны чалавек нашай рэспублікі быў прызначэнцам пажыццёвага парабка знатнага чалавека таго часу.

* *

— Дык вось што я табе скажу, дзяражнькая,—і Кананкоў ласкава пахлопаў жонку па плячы,—будуць у нас каровы, будуць і цяляты. Во не адны мы з табою зараз, вялікая сям'я наша. Будзем жыць у калгасе,—усё ў нас будзе.

Ніводнага прагулу

(§ 8 СОЦДАГАВОРА)

Старшыня калгаса Кушчаняеў Пятро, стары партызан, які прайшоў амаль усе франты грамадзянскай вайны, можа і адчуваў некаторы разлад паміж брыгадзірамі. Але ў гэты гарачы час ён быццам і не думаў мірыць іх.

Прыдзе час, паміраецца, ды яшчэ і як,—думаў ён.

Аднойчы, у самы разгар работы, у гарачы летні дзень да Кананкова, запыхаўшыся падбегла кабета.

— Якімка, хадзі сюды,—усхвалявана паклікала яна.

Кананкоў накінуўся на яе:

— Не перашкаджай, рабіць табе няма чаго ці што? Чаго прыбегла?

— Якімка,—скрозь слёзы адказала тая,—няшчасце, Якімка, бяжы дадому.

— Якое няшчасце—устрывожана спытаўся Кананкоў.

— Дзіцё тваё...

— Што?

— Дзіцянё тваё... памерла... — і закрылася хусткаю, плачучы...

— Бяжы хутчэй дадому.

Уздрыгнуў Кананкоў, апусціў на момант галаву разгублена. Потым азірнуўся вакол, на бушуючае мора каласоў, на гарачую працу. Тольк! буйныя кроплі поту выступілі на загарэлым твары...

— Што-ж будзе Якімка, чаго ты маўчыш, бяжы хутчэй дадому, дзіцё-ж родное памерла.

Выпрастаўся тады Кананкоў Якім і ціха з дрожжу ў голасе адказаў.

—Не магу я пайсці...

І памаўчаўшы, дадаў:

— Кананкоў дагавор на спаборніцтва падпісаў. Ніводнага прагула не зробіць Кананкоў, што-б не адрылася.—Ідзі ты хутчэй, не заміная,—раптам з болем крыкнуў ён.

— Чалавек ты, ці во—з дакорам сказала кабета,—родное дзіця памерла, а ён стаіць, як слуп.

— Чалавек я, дарагенькая,—ціха адказаў Кананкоў,—але зразумей, не магу я пакінуць работу...

Так і пашла кабета.

Цэлы дзень маўчаў Кананкоў, нікому не сказаўшы ні слова. Вялікую боль захаваў ён у сэрцы сваім. Так і не ведала брыгада да самага вечара пра цяжкое гора Кананкова.

Шлях да сяброўства

Уборка ў калгасе «Верны шлях да социялізма» была паспяхова завершана. Адстаючы раней калгас стаў самым перадавым калгасам у перадавым сельсавеце перадавога раёна.

І вось у гэтыя ўрачыстыя дні старшыня перадавога калгаса Пятро Кушчанеў выклікаў да сябе па вельмі важнай справе абодвух брыгадзіраў свайго калгаса.

Упаўголаса (звычайная манера старшыні і гутарыць і даваць загады) ён, звярнуўшыся да брыгадзіраў, сказаў:

— Гэта было яшчэ ў тыя часы, калі нашая вёска была захоплена белапалякамі... У тыя часы нашым партызанскім атрадам камандаваў Владзімір Аляшкевіч. За Коханавым у мястэчку Абольцах, мы рашылі даць першы бой белапалякам...

Брыгадзіры ўважліва слухалі словы старшыні калгаса і ўсё-ж не разумелі, чаго ён ад іх хоча. Гісторыя партызанскага атрада іхняй вёскі, які ў тыя часы звацца Першым беларускім партызанскім атрадам, даўно для іх была вядомай.

Старшыня паглядзіў свае пажаўлічкія вусы і працягваў:

Брыгадзіры. Зверху: брыгадзір Кананкоў, ніжэй—брыгадзір Гурчанкоў.

— Для таго, каб мацнейшым быў наш удар,—мы тады разбіліся на дзве групы,—накшталт двух брыгад. Адна група павінна была ўдарыць у лоб, другая зайсці з тылу... Аляшкевіч быў у першай групе, я ў другой... Першым ударыў на ворагу Аляшкевіч, потым падскочыла мая група. Агульнымі сіламі мы разбілі ворага. Потым, сабраўшыся ў бары, мы пацісвулі адзін аднаму рукі... Таму што вораг у нас адзіны і... праца таксама...

Брыгадзіры паглядзелі адзін на аднаго.

Потым Кананкоў працягнуў руку Гурчанову. Гурчаноў моцна яе паціснуў.

Шэрыя вочы старшыні іскрыліся ўсмешкаю, але быццам нічога не заўважыўшы, ён працягваў далей:

— Дык вось, браткі,—на вайне так: калі адзін другога не падтрымае, то крута прыходзіцца... Яно і цяпер так. Калі не будзе еднасці—не пераможаш.

І старшыня, хітра шчурачы вочы, усміхаўся.

Брыгадзіры задуменна пацвердзілі:

— Т-а-а-ак. Яно, канешне, праўда.

— Я вам скажу так. Калі адна частка церпіць паражэнне, а суседняя перамогу, што трэба рабіць?

Гурчаноў рэзка і рашуча адказаў:

— Зразумела, выручаць трэба.

Старшыня перавёў позірк на Кананкова.

— А ты як думаеш?

— Я думаю, канешне, што адзін другому памагчы павінен...

— Дык вось што, хлопцы,—рашуча абарваў старшыня,—збірайцеся і заўтра-ж паедзем у Оршу, а адтуль у Талачынскі раён. Там, браткі, у калгаснікаў прарыў. Трэба памагчы.

У Талачынскім раёне, пасля напружаных дзён упартай сумоўнай працы, адарылася тое, што павінна было адарыцца. Аднаго разу, ідучы з поля, Кананкоў сказаў Гурчанаву:

—Скажу я табе на шчырасці, што крыўдзіўся, я ў душы крыху на цябе. Бо і брыгада твая першая і выклікаў ты мяне першы. Неяк сорамна мне было тады. І рашыў я не падаша табе. Хацеў давесці, што перасягну я тваю брыгаду. А цяпер, браце, перакапаўся я, што не крыўдзіцца нам трэба адзін на аднаго, а памагаць адзін другому...

Багатая восень

Прышла багатая восень...

Калгаснікі сабралі багаты ўраджай.

Брыгада, якая ездзіла ў Талачын, вярнулася да сваіх звычайных калгасных будняў.

Вясна і лета дружнай упартай работай калгаса «Верны шлях да социялізма» прынеслі плённыя вынікі. У калгасе была правільна арганізавана работа, шырока разгорнута соцспаборніцтва паміж брыгадамі і асобнымі калгаснікамі, быў наладжан дакладны ўлік і праверка.

І дзякуючы гэтаму калгаснікі непрыкметна для сябе рабіліся заможнымі.

— Што я быў такое раней?—кажа былы бядняк, цяпер член праўлення калгаса Марчанка.—Нішто я быў. Галота. Казалі: гэта ад таго, што мы беднякі, культаі. А які ты культай, калі зямлі тае шматок, папрабуй, разганіся на ёй. Унь, кажуць, той дык адмысловы гаспадар. У яго і каса бліскучая і ўсё ў яго добра. Я, значыць, культай, а ён малайцом. Яму добра было малайцом быць. Яму жонка перад выхадам на касьбу і скварку, і блінцы, і смятанку. Дык у яго і каса бліскучая. А мне жонка чыгунок бульбы наварыць, я яго з'ем, дык сапуцца не магу. Вось табе і культай. А цяпер, хто скажа, што мы культаі? Ніхто не скажа. Унь бабы да брыгадзіра ідуць: «Работу давай»—крычаць. А чаму? Таму, што на сябе працуем, таму што не культаі мы, а заможнае жыццё заводзім... бач, та, наш калгас перавыканаў усе нормы. Азімага пасеву было па плану 64 га, засеялі 75 га. Ворыва пад зяб было па плану 110 га, узарана 112 га. Да гэоміну здалі, з перавышэннем усе загатоўкі.

Калгас стаў спраўды заможным...

Сёння калгаснікі Даніла Янкоўскі і Цімашоў Марка атрымліваюць толькі зернавых па тры тоны. Колькасць зернавых і іншых культур на прападзень у параўнанні з мінулым годам значна вырасла.

Калгас атрымаў чырвоны сцяг.

Калгаснікі моцна трымаюць гэты сцяг.

Яны разгортваюць далей будаўніцтва калгаса.

Зараз будуецца яшчэ адна ферма. **Пабудавана пазня. Да окцябрскіх свят праводзяць электрычнасць, тэлефон і радыёфікуюць калгасныя хаты.**

Усе калгаснікі—члены Асоавіяхіма. Усе дабіваюцца звання парашылаўскіх стралкоў.

Гэтым летам калгаснікі лятаці **на сваім** самалёце. Перад гэтым доўга працавалі над пабудовай пасадачнай пляцоўкі.

Пяць лепшых калгаснікаў з вышыні тысяча кілометраў азіралі свае калгасныя палі.

Так жывуць людзі калгаса «Верны шлях да социялізма». **Яны апраўдалі назву свайго калгаса, бо яны сапраўды сталі на верны шлях да социялізма.**

Дзяцей Кананкова не чакае той лёс, які напаткаў дваццаць год таму назад Якімку Кананкова.

А. ВОЛЬНЫ.

Аршаншчына.



Да гадавіны вялікага Окцябра калгас поўнасцю электрафікуецца. НА ЗДЫМКУ: устаноўка трансфарматарнай будкі.

Праводка электрычнасці ў дамах калгаснікаў. На пярэднім плане—дом брыгадзіра Кананкова.

ГАЛАДОЎКА ВЕНГЕРСКІХ ГАРНЯКОЎ.

950 гарнякоў, працаваўшых у вугальных шахтах Дунайскага пара однага таварыства ў Пены (Венгрыя) абвясцілі з бастоўку і адначасова галадоўку. Гарнякі спусціліся ў шахты і аставаліся там без харчу звыш 130 гадзін. Падтрыманыя таварышамі па рабоце гарнякі дабіліся ад прадпрыемцаў здавальнення сваіх патрабаванняў.

НА ЗДЫМКУ: група гарнякоў з Печа таржаствуе перамогу з бастоўкі.

МОРСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ У ЛОНДАНЕ

ЛОНДАН, 30 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, у нарадзе брытанскай і амерыканскай морскіх дэлегацый ад **Англіі** прымалі ўдзел Макдональд, Саймон, морскі міністр Эйрес, Мансель і інш., а ад **ЗША** — Норман Дэвіс, адмірал Стэнлі, Вільсон і інш. Прынята рашэнне, што як Англія, так і ЗША павінны «весці ігру цярпення». Абедзве краіны паводле слоў агенцтва, лічаць неабходным прадаўжаць морскія перагаворы.

ПОСПЕХІ АДЗІНАГА ФРОНТА У ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 30 кастрычніка. (БЕЛТА). Цята да адзінства дзеянняў у прафсаюзах пракладае сабе дарогу, наперакор сабатажу і адкрытай абароне рэфармісцкіх прафсаюзаў. «Юманітэ» паведамляе, што унітарыі і рэфармісцкі прафсаюзы грузчыкаў трох важнейшых портаў — Булоні, Калэ і Дзюнкерка—рашылі ажыццявіць адзіны фронт для барацьбы за канкрэтныя патрабаванні рабочых і вылучылі для гэтай мэты ўзгадняльны камітэт. Прынятая сумесна рэзалюцыя заклікае іншых рабочых наследаваць прыкладу грузчыкаў гэтых трох портаў.

У горадзе **Сан-Эт'ене** адбыўся мітынг. Прысутныя на мітынгу 8 тыс. рабочых пратэставалі супроць праекта пазбаўлення дзяржаўных служачых права стачак. Мітынг прыняў рэзалюцыю, якая патрабуе ажыццяўлення адзінства профсаюзаў.

Згодна вестак **«Пці парызьен»**, мітынг адзінага фронта ў Акіньёне сабраў, не гледзячы на забарону паліцыі, паўтары тысячы чалавек. З чырвонымі сцягамі і спевам «Інтэрнацыянала» рабочыя прайшлі па галоўных вуліцах горада.

ФАШЫСЦКІЯ СУВЯЗІ ХАРВАЦКІХ ТЭРАРЫСТАЎ

ВЕНА, 30 кастрычніка. (БЕЛТА). Як паведамляе югаслаўскі друк, арышт аўстрыйскімі ўладамі лідэра харвацкіх нацыяналісцкіх эмігрантаў **Перчэвіча** зроблен выключна ў рэзультаце энергічнага дэмарша французскага міністра замежных спраў Лаваля.

Паведамленне аўстрыйскіх улад аб тым, што вобыск і допыт Перчэвіча ўстанавіў пібыта яго непрычаснасць к марсельскаму замаху, выклікала рэзкія нападкі з боку югаслаўскага друку. Газета **«Время»** сцвярджае, што венская кватэра Перчэвіча апошнія гады служыла памяшканнем штаба харвацкіх нацыяналісцкіх груп, дзе выпрацоўваліся планы замахаў, адбываліся насяджэнні і сустрэчы. Пад кіраўніцтвам Перчэвіча ў Вене выдаваўся рэзка антыюгаслаўскі бюлетэнь харвацкіх нацыяналістаў пад назвай **«Грыч»**. Перчэвіч, паводле слоў газеты, асабіста падтрымліваў сувязь з германскімі, венгерскімі, італьянскімі і аўстрыйскімі фашыстамі і рэвізіяністкімі коламі і атрымліваў з розных крыніц буйныя сумы. З гэтых сум фінансаваліся харвацкія тэрарыстычныя арганізацыі.

ВЕНА, 30 кастрычніка. (БЕЛТА). З Сафіі паведамляюць, што балгарскімі ўладамі арыштован па абвінавачанню ў сувязях і супрацоўніцтве з фашысцкай арганізацыяй македонскіх аўтанамістаў быўшы начальнік гарнізона Сафіі генерал **Георгіеў** і б. начальнік разведачнага ўпраўлення балгарскага ваеннага міністэрства генерал **Поркаў**.

НА УЗРОЎНІ МІЖНАРОДНАГА СПОРТУ

„КУР'ЕР ЦОДЗЁННЫ" аб ВЫСТУПЛЕННЯХ СОВЕЦКІХ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ У ЧЭХАСЛАВАКІІ

ВАРШАВА, 30 кастрычніка. (БЕЛТА). Апісваючы сустрэчы совецкіх спартсменаў з чэхаславацкімі спартыўнымі камандамі, пражскі карэспандэнт **«Кур'ера цодзённага»** паведамляе: «Найбольш сенсацыйным момантам асеннага сезона ў Празе былі, несумненна, выступленні совецкіх спартсменаў—футбалістаў і лёгкаатлетаў.

Калі мяркаваць на таму, што нам прадэманстравалі прадстаўнікі совецкага спорту ў Празе, спорт у СССР паказаў добры **міжнародны** клас. Ва многіх адносінах выступленні баксёраў былі прыемным сюрпрызам. Побач з найлепшымі фізічнымі данымі, што ў асноўным для нас не было нечаканасцю, яны адзначаліся не менш добрай тэхнікай, і гэта з'явілася для нас поўнай нечаканасцю. Не падлягае сумненню, што совецкія баксёры могуць спаборнічаць з кім-бы там ні было ў Еўропе з шансамі на поспех. Няма патрэбы падкрэсліваць, што іх паводзіны на спаборніцтвах былі ў поўным сэнсе гэтага слова ўзорнымі...

Не менш удачнымі былі выступленні совецкіх футбалістаў. У сустрэчы з перадавой чэшскай камандай **«жыдэніцы»** яны перамаглі з рэзультатам 3:2 і заслужылі гэту перамогу. І тут совецкія спартсмены паказалі сур'ёзную тэхнічную падрыхтоўку і немалы тэхнічны вопыт».

К ПЕРАГАВОРАМ АБ КУЧ

За апошні час японская прэса зноў пачала пашыраць няправільную інфармацыю аб становішчы перагавораў аб КУЧ. Следуючы гэтаму пачыну, прэса ў Манчжурыі, як і раней у падобных выпадках, падняла антысавецкую кампанію, даходзячы да самых дзікіх абвінавачанняў супроць СССР. У сувязі з гэтым ТАСС сабраў у кампетэнтных колах інфармацыю па пытаннях перагавораў і прапануе іх увазе грамадскай думкі.

У хуткім часе пасля апублікавання паведамленняў ТАСС ад 18 і 27 жніўня аб ходзе перагавораў па продажы КУЧ, прадстаўнікі японскага міністэрства замежных спраў прапанавалі аднавіць перагаворы, спыненыя ў пачатку жніўня ў рэзультаце патрабаванняў япона-манчжурскага боку аб прыняцці ўсіх яго прапаноў.

6-та верасня міністр замежных спраў **Хірота** прапанаваў **т. Юрэневу** павялічыць прапанаваную 23 ліпеня япона-манчжурскім бокам цану за КУЧ з 120 млн. іен да 130 млн. іен.

12-га верасня т. Юрэнеў заявіў Хіроце, што, на думку совецкага ўрада, пасля 15-месячных перагавораў не трэба ставіць на шлях дробнага і працяглага гандлю і што пара ўжо сапраўды закончыць перагаворы. Хоць цана ў 160 млн. іен, прапанаваная совецкім урадам яшчэ 30 ліпеня, і прадстаўляе ўжо вялікую ахвяру з боку СССР, паколькі яна значна ніжэй сапраўднага кошту дарогі, — совецкі ўрад гатоў пры ўмове спынення торгу і неадкладнай згоды японскага ўрада на гэту прапанову дагаварыцца на сярэдняй цане, атрыманай шляхам падзелу папалам розніцы паміж совецкай прапановай у 160 млн. іен і японскай прапановай у 130 млн. іен, г. зн. на 145 млн. іен.

У адказ на гэта Хірота прапанаваў замест 145 млн. іен — 140 млн. іен.

19 верасня т. Юрэнеў паведаміў Хіроце, што совецкі ўрад, не жадаючы ўдзельнічаць у зацяжванні перагавораў, згодзен прадаць КУЧ за 140 млн. іен, не лічачы сум, якія новы ўласнік КУЧ павінен будзе выплаціць звальняемым рабочым і служачым КУЧ.

Пасля дасягнення згоды аб цане перагаворы прадаўжаліся на іншых умовах продажы КУЧ. Сярод гэтых умоў найбольшая ўвага ўдзяляецца двум пытанням: аб парадку перадачы дарогі і аб гарантыях выплаты выкупной сумы.

Па першаму пытанню япона-манчжурскі бок высунуў прапанову аб неадкладным пераходзе ўсіх праў на дарогу к Манчжоу-Го з моманту падпісання пагаднення аб продажы КУЧ. Разам з тым япона-манчжурскі бок настойваў, аднак, на перадачы дарогі новаму ўласніку на працягу месяца пасля падпісання згоды аб продажы КУЧ. Совецкі бок у мэтах хутчэйшага дасягнення згоды прыняў прапанову Хірота аб неадкладным услед за падпісаннем пагаднення пераходзе праў на дарогу к Манчжоу-Го, аднак, не мог згадзіцца з прапанаваным парадкам здачы-прыёмкі дарогі, бо практыка гэта азначала-б, што гаспадаром КУЧ было-б Манчжоу-Го, а адказнасць за работу і гаспадарку дарогі нёс-бы на працягу гэтага часу совецкі бок. Пры вядомых настроях некаторых япона - манчжурскіх улад, такое становішча магло-б выклікаць сур'ёзныя канфлікты і небяспекі для адносін паміж абодвума дзяржавамі.

Паколькі дарога прадаецца не па яе сапраўднаму кошту, а па ўмоўленай поўшальнай цане, прадстаўляецца неабгрунтаваным япона-манчжурскае патрабаванне аб здачы і прыёмцы дарогі па вопісі. Гэта патрабаванне тым больш неабгрунтавана, што ў свой час п. Хіроце была ўручана справка аб становішчы рахункаў дарогі і ў тым ліку аб усіх абавязацельствах дарогі, якія павінен будзе пераймаць новы ўласнік дарогі. Само сабой разумеецца, што к моманту падпісання пагаднення аб продажы дарогі будзе складзена дадатковая справка аб абавязацельствах, узнікшых пасля ўручэння першай справкі.

Наступным пытаннем, выклікаўшым затрудненні, з'яўляецца пытан не аб выдачы Манчжоу-Го Совецкаму Саюзу абавязацельстваў на тую частку выкупной сумы, якая не падлягае неадкладнай уплаце, і аб гарантаванні Японіяй гэтых абавязацельстваў Манчжоу-Го ў адносінах як грашовай, так і тавараай часткі плацяжоў. Хірота пярэчыць супроць гэтага патрабавання совецкага боку, прапануючы замест атрымання абавязацельстваў прынцып давер'я Манчжоу-Го з боку СССР. Тым часам абсалютна зразумела жаданне СССР, які перадае Манчжоу-Го неадкладна пасля падпісання дагавора белізарны транспартна-гаспадарчы камбінат — забяспечыць выканапне з боку Манчжоу-Го яго абавязацельстваў, якія **расцягваюцца на тры гады.**

З астатніх спрэчных пытанняў важнае месца займае пытанне аб звароце маемасці СССР, не належачай КУЧ і застраўшай у Манчжурыі і з часу інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны.

Па раду іншых пытанняў дасягнута ўжо дагаворанасць. Устаноўлена, што $^2/_3$ выкупной сумы паступаюць таварамі і 1/3 грашовымі пла цяжамі з правам пераводу апошніх за граніцу, прычым палова гэтай апошняй сумы выплачваецца зараз-жа пасля падпісання дагавора.

Дасягнута далей прынцыповае пагадненне аб тым, што ў выпадку падзення іены ніжэй пэўнага «предела», грашовыя плацяжы будуць пералічвацца па залатому курсу.

Па пытанню аб звальненні совецкіх служачых і рабочых дасягнута пагадненне, што новая манчжурская адміністрацыя будзе папярэджваць рабочых і служачых аб звальненні за 3 месяцы з прадастаўленнем ім пасля звальнення права двухмесячнага прабывання ў Манчжурыі для ліквідацыі асабістых спраў. Звальняемыя апрымліваюць у адносінах пенсій і выходных дапамог поўны разлік згодна існуючых на дарозе правіл, а таксама бясплатны праваз для сваіх сем'яў і маемасці да граніцы з СССР.

З прыведзенага відаць неабгрунтаванасць кампаніі большасці органаў японскай і манчжурскай прэсы. Ніхто не можа адмаўляць, што СССР за час амаль паўтарагадовых перагавораў паклаў многа намаганняў для іх паспяховага завяршэння ў інтарэсах совецка-японскіх адносін і справу міру паслужыў. Не яго віна, калі яго намаганні сустракалі перашкоды з боку яго контрагентаў.

У кампетэнтных колах указваюць, што перагаворы зацягнуліся між іншым і з прычыны неадпаразовых выпадкаў адмаўлення япона-манчжурскага боку ад раней робленых ім прапаноў.

Астатнія разгалоссі зводзяцца ў аспоўным к забеспячэнню ўплаты выкупной сумы.

Думаюць, што калі япона-манчжурскі бок праявіць добрую волю, пагадненне і па гэтых астатніх пытаннях можа быць дасягнута ў ней карацейшы тэрмін. (ТАСС).

РАБСЕЛЬКОРЫ КІЕЎШЧЫНЫ У АРШАНСКІМ РАЁНЕ

29 кастрычніка ў Аршанскі раён з Віцебска прыбыла на веласіпедах брыгада рабселькораў Кіеўшчыны, арганізаваная сакратарыятам ВУЦВК па ініцыятыве абласной газеты «Пролетарская праўда». Брыгада азнаёмілася з ходам падрыхтоўкі да перавыбараў советаў у перадавых Якаўлеўскім і Яромкаўскім сельсоветах.

30 кастрычніка брыгада выехала ў Магілеў.

МІКУЦКІ.

Удзельнікі велапрабега Кіеў-Харкаў-Масква-Ленінград - Віцебск - Магілеў - Гомель - Кіеў — у Віцебску на пляцы Свабоды. Прабег прысвечан перавыбарам советаў.

МАГІЛЕЎ, 31 кастрычніка (**Па тэлефону ад карэспандэнта «Звязды»**).

Учора ў Магілеў прыбылі ўдзельнікі рабселькораўскай велаэстафеты. Удзельнікі эстафеты наведалі Слабодскі сельсавет і мелі гутарку з актывам сельсавета. Сёння эстафета накіравалася ў Гомель.

ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД СЛЯПЫХ

29 кастрычніка ў Менску адкрыўся першы ўсебеларускі з'езд сляпых. У яго рабоце прымаюць удзел 39 дэлегатаў, у тым ліку прадстаўнік Заходняй вобласці.

З'езд віталі ад ЦК КП(б)Б тав. **Екельчык**, нарком сацыяльнага забеспячэння БССР тав. Марусевіч, член прэзідыума Беларускага таварыства сляпых тав. **Ваўчок** і прадстаўнік Заходняй вобласці тав. **Борухман.**

З дакладамі выступілі старшыня цэнтральнага праўлення таварыства сляпых Беларусі тав. **Смольскі** і прадстаўнік Наркомасветы тав. **Берліна.**

Учора праф. **Дворжэц** зрабіў даклад аб слепане і яе прычынах. Дакладчык прывёў надзвычай цікавыя данныя. Пасля Акцябрскай рэволюцыі колькасць сляпых значна зменшылася. Па перапісу 1897 года на 10.000 жыхароў прыпадала 21,6 сляпых, а ўжо ў 1926 годзе—13,5. Трахома скарацілася на 42 проц. Узрасла колькасць ложкаў для хворых на вочы ў больніцах. Растуць кадры дактароў-акулістаў. У Гомелі адкрыт трахоматозны інстытут, адкрываецца трахоматозная лячэбніца ў Менску.

На працягу гэтага года на паляпшэнне матэрыяльна-бытавых умоў сляпых адпушчана звыш 100.000 р. У Беларусі 10 розных майстэрань, у якіх працуюць 597 сляпых, ёсць 2 школы для сляпых дзяцей, арганізаваны інтэрнаты.

З'езд паслаў прывітальныя тэлеграмы тт. **Гікало, Чарвякову і Галадзеду.**

У памяшканні, дзе адбываецца з'езд, адкрылася выстаўка прадукцыі майстэрань, у якіх працуюць сляпыя.

У ВІЦЕБСК ПРЫЯЗДЖАЮЦЬ т.т. МОЛАКАЎ І БАБУШКІН

ВІЦЕБСК. (**Ад карэспандэнта «Звязды»**).

3 лістапада ў Віцебск прыязджаюць з Масквы Герой Совецкага Саюза лётчык тав. **Молакаў** і лётчык-палярнік тав. **Бабушкін.**

Тт. Молакаў і Бабушкін выступяць на сходах рабочых з дакладамі аб паходзе «Чалюскіна» і рабоце выратавальнай экспедыцыі.

ЗАРУБЕЖНЫ.

АГІТЗВЯНО ІМЯ III УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА РАБСЕЛЬКОРАЎ

МАЎЧАЛЬНІКІ

Да гэтага часу ўпёсшы грашы працягваюць маўчаць **«Віцебскі пролетарый»** (нам. адказнага рэдактара тав. **Вержбаловіч**), **«Палеская праўда»** (рэдактар т. **Бугроў**), **«Комунар Магілеўшчыны»** (рэдактар т. **Іофе**), **«Комуніст»** (рэдактар тав. **Столін**), **«Ленінскі шлях»** (рэдактар тав. **Дамарацкі**) і **«Большэвік Барысаўшчыны»** (рэдактар тав. **Мятла**). Няўжо, тт. рэдактары, вы не разумееце, што ваша злачынная бяздзейнасць зрывае збор сродкаў на пабудову агітвяна?

Да адкрыцця з'езда рабселькораў, асталося ўсяго 20 дзён. Неадкладна, большэвіцкімі тэмпамі трэба правесці збор сродкаў.

***

⊙ Чытачы газеты **«Большэвіцкі змагар»** (Ельск) дадаткова ўносяць на пабудову агітвяна самалётаў імя 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў 500 рублёў.

«Большэвіцкі змагар»
ТУЧЭНКА.

* Калектыў студэнтаў **барысаўскага падтахнікума** ўнёс на пабудову агітвяна 94 руб. 13 кап. і выклікаў наследаваць свайму прыкладу калектывы барысаўскага медрабфака, лесрабфака і лесашколы.

Л. ГОРФІНКЕЛЬ.

* Рэдакцыя газеты **«Калгаснік Кармяншчыны»** распачала работу па збору сродкаў на агітвяно. На раённым зёлёце рабселькораў сабрана 130 рублёў. Кожны селькор абавязаўся сабраць на агітвяно па 25 руб.

Нам. рэдактара «К. К.»
ВАЛОДЗІН.

* Рэдакцыяй газеты «За большэвіцкі калгас», паліталдзела Капыльскай МТС, на пабудову агітвяна сабрана на 27 кастрычніка 278 руб., рабкорамі МТС—117 руб., селькорамі Браткоўскага сельсавета — 193 руб. і т. д.

А. ШЭЎЧАНКА.
А. БУРАЎ.

Сродкі на пабудову агітвяна трэба пералічваць у Беларускае Дзяржбанка на бягучы рахунак № 160/10006.

Адказны рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

МЕНСК

ШАХМАТНЫ МАТЧ СІЛІЧ — ВЕРАСАЎ.

15 лістапада ў Менску адбудзецца матч паміж шахматнымі майстрамі БССР **Сілічам і Верасавым.** Будзе разыграна 5 партый.

Пераможцу будзе прадастаўлена месца на ўсесаюзным шахматным турніры, які адбудзецца і снежня ў Маскве. У гэтым турніры прымуць удзел вядомыя шахматысты Румін, Батвінік, Рамэноўскі і інш.

НАДВОР'Е ПА БССР

Паводле вестак бюро надвор'я, па БССР у перыяд з 31 кастрычніка па 3 лістапада чакаецца значная воблачнасць, прахадзячыя ападкі, мясцамі туманы, часамі ўзмацненне ветра. К канцу перыяда паніжэнне тэмпературы, магчыма да слабых маразоў, памяншэнне воблачнасці, спыненне ападкаў. На поўдні пераважна без ападкаў.

Арыентыровачна да 6 лістапада надвор'е пераважна без ападкаў, хістанне тэмпературы.

⊙ ⊙ ⊙

* **КУРСЫ ЖЫВАПІСІ** для вучняў пачатковых і фабрычна-заводскіх школ арганізуе тарадскі аддзел народнай асветы ў лістападзе. На курсы будзе прынята 25 вучняў, якія праявілі здольнасць да жывапісі.

У лабараторыі хімінстытута

РАБКОРЫ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НА ДАПАМОГУ ТРАНСПАРТУ

Нарада рэдактароў шматтыражак менскіх прадпрыемстваў уключылася ў абвешчаны газетамі «Звязда, «Большевистский путь» і журналам «Большэвіцкі друк» рэйд праверкі падрыхтоўкі транспарта да зімы.

Кожная шматтыражка вылучае брыгады рабкораў у дапамогу рабкорам транспарта. Шматтыражкі бяруць шэфства над чыгуначнымі насценгазетамі і арганізуюць абмен вопытам.

⊙ ⊙ ⊙

* **Стралковыя спаборніцтвы** на 12 прадпрыемствах горада — заводах «Комунар», імя Варашылава, імя Молатава і інш.—правядзе стралковы клуб у дзень святкавання XVII гадавіны Акцябра.

* **Новы чэрвеньскі рынак** адкрываецца сёння.

* **Памяшканне для ўзорнага прадуктова-гастранамічнага магазіна** адведзена Белхарчгандлю ў новым доме спецыялістаў.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад 31 кастрычніка
НА ЭКРАЧЕ
новая праграма
ЗАМЕЖНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ.

У ПРАГРАМЕ НОВЫ САЮЗКІНО-ЖУРНАЛ

ЗВЫШ ПРАГРАМЫ
Гастролі ФРАНКАРДЗІ
НОВЫ РЭПЕРТУАР.
ШТОДЗЕННА 4 СЕАНСЫ. | Пачатак у 6, 7-45, 9-15, 11 г.

УСІМ ФАЕЗАЎМЯСЦКОМАМ.
Культаддзел ЦСПСБ і дырэкцыя Белдзяржтэатра оперы і балета
паведамляюць што **6 лістапада**
— адбудзецца —
МІЖСАЮЗНЫ СПЕКТАКЛЬ
Заяўкі на культпаходы у тэатр у пакаваны дзень **прымаюцца** ў касу тэатра 12 да 2-х і з 5 да гад. вечарэе
КУЛЬТАДДЗЕЛ ЦСПСБ
ДЫРЭКЦЫЯ ТЭАТРА.

У НК Асветы
ўстаноўлены
дзяжурствы
адказных работнікаў
у выхадныя дні
з 9 гадзін раніцы да 11 гадз. вечара (пакой № 563, тэлефон 22-733 і 22-735).
НАРКАМАСВЕТЫ.

Навучальны камбінат ВОСУ
АБ'ЯЎЛЯЕ
НАБОР КУРСАНТАЎ
НА 6-МЕСЯЧНЫЯ **КУРСЫ**
па падрыхтоўцы 2-х груп **бухгалтароў** для раённай сістэмы **Белкаапрамсавета.** Стыпендыя ад 100 да 150 руб. у месяц і квартэрных 25 р. Інтэрнатам курсанты не забяспечваюцца. Курсанты прымаюцца асобы, маючыя рахунковы стаж не менш 1 года, з адукацыяй за 7 класаў. Да заяў дадаць дакументы аб соцпаходжанні, адукацыі, прапоўным стажы, узросце, вызваленні ад працы, аб адносінах да вайсковай службы і на 40 кап. марак. Заявы без усіх дакументаў не разглядаюцца. Заявы прымаюцца ў канцылярыі камбіната ВОСУ (Менск, Рэволюцыйная, 3) да 20 лістапада ад 10 да 12 г. дня.
Аб залічэнні будзе паведамлена па пошце. **Дырэкцыя.**

Віцебскі педагагічны інстытут
АБ'ЯЎЛЯЕ **ПРЫЁМ**
на ЗАВОЧНЫЯ КУРСЫ
па падрыхтоўцы ў дзённы інстытут.
Тэрмін навучання 8 месяцаў.
Кіраўніцтва вучэбнай работай ажыццяўляецца пры ўмове ўдзелу ў рэгулярнае пісьмовых кантрольных работ завочнікаў, выклік на заключную канферэнцыю.
Умовы прыёму:
1. Прымаюцца работнікі пачатковай і няпоўнай сярэдняй школы рабочыя, калгаснікі і служачыя ад 18 да 30 год, маючыя адукацыю не ніжэй 8 класаў сярэдняй школы.
2. Пры паступленні на курсы патрабуюцца дакументы: заява—анкета, заверная кіруючай арганізацыяй.
Абавязкова да заявы прыкладваецца згода з райана аб водпуску з работы восенню 1935 г. Даведка аб соцпаходжанні. Дакумент аб скончэнні навучальнай установы, аднялік ад вытворч. і грамадскай работы і ўлік ранкі, даведка аб становішчы здароўя.
Заявы прымаюцца ад 20 лістапада.
Пачат к заняткаў і снежня.
Дырэкцыя.

МЕНХАРЧГАНДАЛЬ
паведамляе, што **цэны** на
пшанічныя вотрубі
з 1 лістапада
значна паніжаны.
Продаж праводзіцца
ў наступных мясцах:
ПЯРЭСПА, крама № 46,
СУРАЖСКІ РЫНАК, крама № 47,
ТРОІЦКІ БАЗАР, крама № 43,
КРЫТЫ РЫНАК, крама № 42,
КАМАРОЎКА, крама № 23,
ЮБІЛЕЙНЫ ПЛЯЦ крама № 45,
ПАСЁЛАК „КОМІНТЭРН", крама № 48,
ТАТАРСКАЯ вул., крама № 44.

Гукавы кіно-тэатр „Пролетарый" — **ЗАКРОЙШЧЫК З ТАРЖКА** Канцэрт Усходн. ансамбля.

Кіно „Інтэрнацыянал" — Совецкі мастацкі фільм **ПАЭТ І ЦАР**

Кіно „СПАРТАК" — Выдатны фільм **Капрыз Екацерыны II** драма ў 7 частках.

Беларускае кіраўніцтва сувязі
даводзіць да ведама, што для паляпшэння апрацоўкі тэлеграм
забараняецца ПРЫЁМ ТЭЛЕГРАМ,
напісаных алоўкам, не яскрава, на паперай і на папіросной паперы, з прадстаўленай на тэксце пячаткай, без подпісу ад казанымі асобамі ўрадавых тэлеграм і тэлеграм абагуленага сакітара.

ШУКАЮ 1—2 пакоі ў любым раёне. Згодзен на рамонт і іншыя выгадзі. Званіць па тэл. № 21-260.

ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — **АД 5 ЛІСТАПАДА** — *ГУКАВЫ КІНО-ТЭАТР „ПРОЛЕТАРЫЙ"*

„ТРЫ ПЕСНІ АБ ЛЕНІНЕ"
Вытворчасць Міжрабпомфільма.
Рэжысер **Д. ВЕРТАЎ.**

„Ленін—горны арол, які не ведае страху ў барацьбе і які адважна вядзе ўперад партыю па нізведаных шляхах рускага рэволюцыйнага руху".
(І СТАЛІН).

„Стойце моцна, стойце дружна, смела ўперад супроць ворага, за намі будзе перамога. Улада памешчыкаў і капіталістаў, зломленая у нас, у Расіі, будзе пераможана ва ўсім свеце"— так гаварыў Ленін і яго словы зафіксаваны ў карціне.

ПЕСНЯ ПЕРШАЯ. **У ЧОРНАЙ ТУРМЕ БЫЎ МОЙ ТВАР...**
ПЕСНЯ ДРУГАЯ. **МЫ ЛЮБІЛІ ЯГО...**
ПЕСНЯ ТРЭЦЯЯ. **У ВЯЛІКІМ КАМЕННЫМ ГОРАДЗЕ...**

САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ! **САЧЫЦЕ ЗА РЭКЛАМАЙ!**

Галінавая страхкаса ЦП саюза работнікаў зямельных органаў БССР
паведамляе, што ўсе ўстановы НКЗБ райза, Сельгасснаб, ветэрынарнай сеткі бактэрыялагічнай станцыі раслінаводства навуковадаследчыя інстытуты, якія знаходзяцца ў ведамі НКЗБ, Сельэлектра, працуючыя па найму у калгасах раёна дзейнасці МТС і па зв'ю, **аб'яднаўваюцца** ў сувязі з рэарганізацыяй профсаюзаў **у ЦП саюз. работнікаў земорганаў**
На основе гэтага яны абавязаны да 5 лістапада 1934 г.
перарэгістравацца.
З 1-га лістапада г.г. страхузносы ў пазычнасць за мінулы час трэба ўносіць **на бягучы рахунак № 9058.**
Заплочаныя страхузносы на старыя рахункі з лістапада месяца г.г. да заліку прымацца не будуць.
ЦП саюза работнікаў земорганаў

Мсц. слаўскаму педтэхнікуму патрэбны ВЫКЛАДЧЫКІ:
матэматыкі, мовы і літаратуры.
Нагрузка гарантуецца.
Тэхнікум забяспечвае кватэрай і кому нальнымі услугамі.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Н. К. Ц. П.
САЮЗВОДСТРОЙ
Аддзяленне ўсесаюзнай буравой канторы „БУРВОД"
па БССР, Зах. вобл. і Украіне
прымае
СВІДРАВАННЕ КАЛОДЗЕЖАЎ
на віду са сваіх матэрыялаў.
Звяртацца: Гомель, вул. Леніна, 18, **„БУРВОД".**

Да ведама лабараторый, соўгасаў, калгасаў, каапгасаў і інш. арганізацый.
Даводзіцца да ведама, што **лабараторыя зоатэхнічнага аналізу пры кафедры кармлення**
Віцебскага ветэрынарна-зоатэхнічнага інстытута робіць **аналізы кармоў торфу,** пастаўляе **растворы для хімічнага аналізу, дэцынармальныя растворы кіслот і шчолакаў для малочных лабараторый, дае кансультацыі па арганізацыі лабараторый** і т. д.
Аналізы і заготоўка рошчын робяцца за плату згодна калькуляцыі.
Перасылка па адрасу: г. Віцебск. Ветзоінстытут, кафедра кармлення.
Зав. кафедры дацент **ЛЕМЕШ.**

На падставе пастановы VII пленума ЦК сувязі СССР,
ЦП саюза сувязі Беларусі
разбуйняецца на два саюзы
паштовай і электрычнай сувязі.
Усе прэтэнзіі да былога ЦП сувязі прымаюцца ліквідкомам да 5 лістапада г.г. Пасля гэтага тэрміна прэтэнзіі прымацца не будуць.
Адрас: Менск, Дом працы, 3-ці паверх, пакой № 18.
ЛІКВІДКОМ.

Друкарні „ЗВЯЗДА" патрэбны **ВАРТАЎНІКІ**
для аховы друкарні.
Грыбмінчыкі на ратацыйнай машыне і вучні-лінотыпісты.
Звяртацца: Совецкая, 65, II-гі паверх, да дырэктара, з 12 да 1 гадз. дня.

Менск, друкарня «Звязды». Выпускаючы—БУТОМАЎ С., ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. метранпаж — Н. ПЕРАКЛАДНЕЎ, ст. стэрэатыпёр — КАГАН Е., ст. друкар — АНУЧЫН. Уп. Галоўлітбела № К—3283.